Вядомы журналіст і фатограф падчас вандровак па краіне, фатаграфаваў замкі, касцёлы, цэрквы, сядзібы. І аднойчы заўважыў, што сярод шматлікіх фотаздымкаў нямала аб'ектаў Першай сусветнай вайны...

СТАР. 3

Андрэй Мрый — вядомы беларускі пісьменнік, былы супрацоўнік «Звязды». У 1929-м ён стварыў непаўторныя «Запіскі Самсона Самасуя», якія надрукавалі ў Мюнхене толькі праз 24 гады.

СТАР. 4

Чаго вы баіцеся або стараецеся пазбягаць так, на ўсялякі выпадак? Чорных котак? Жанчыны з пустым вядром? Расколін на асфальце? Або 13-га чысла, асабліва калі яно прыпадае на пятніцу?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЖНІЎНЯ 2013 г. СУБОТА № 153 (27518) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫТВОРЦЫ ЦЭМЕНТУ АБ'ЯДНАЮЦЦА Ў КАРПАРАЦЫЮ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў стварэнне нацыянальнай холдынгавай структуры «Беларуская цэментная карпарацыя». Аб гэтым ішла размова ў час наведвання Прэзідэнтам філіяла «Крычаўцэмент» ААТ «Крычаўцэментнашыфер», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Плануецца, што ў склад холдынга ўвойдуць 3 беларускія заводы па вытворчасці цэменту — Беларускі цэментны завод, ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» і ААТ «Крычаўцэментнашыфер», а таксама транспартна-лагістычная кампанія. Стварэнне гэтай структуры прадугледжваецца ў 2014 годзе, у 2015-м — прыцягненне стратэгічнага інвестара.

У выніку такой інтэграцыі чакаецца зніжэнне сабекошту будаўнічых матэрыялаў, што вырабляюцца на аснове цэменту і вапны, рост валавой дабаўленай вартасці, рэнтабельнасці продажаў, выручкі на аднаго працуючага, асваенне новых відаў канкурэнтаздольнай прадукцыі з цэменту з высокай дабаўленай вартасцю, пашырэнне рынкаў збыту, рост аб'ёмаў продажаў і валютнай выручкі.

«Калі вы вырашылі ствараць такі холдынг, кіраўнікі прадпрыемстваў не супраць, гэта прынясе эфектыўнасць, — дзейнічайце», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Але калі вы такім чынам думаеце зарэтушаваць праблемы — не атрымаецца. У канцы павінна быць эканоміка, эфектыўнасць. Я не буду ў вас пытацца, па якой цане закупляеце сыравіну, прадаяце гатовую прадукцыю, мяне будзе цікавіць агульны вынік. Таму, робячы гэты крок, адразу думайце, як вы будзеце даваць справаздачу па эканоміцы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка даручыў да лістапада 2014 года запусціць новыя заводы па вытворчасці жалезабетонных канструкцый і штучнага каменю. Абодва праекты плануецца рэалізаваць на базе Беларускага цэментнага завода.

Кіраўнік дзяржавы даручыў старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандру Якабсону ўзяць пад кантроль гэтыя пытанні. «Усе гэтыя планы не павінны быць манілаўшчынай, — сказаў Прэзідэнт. — Каб у нас не атрымалася тое, што цяпер адбываецца ў будаўніцтве: намецілі, камень залажылі і 5-7 гадоў будуем. Калі такі вялікі попыт на гэту прадукцыю, то трэба хутка ў гэту нішу ўскочыць». Аляксандр Лукашэнка даручыў таксама наладзіць вытворчасць жалезабетонных канструкцый і штучнага каменю ў філіяле «Крычаўцэмент» у ААТ «Крычаўцэментнашыфер».

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ ПЕРШАЯ ЗАВЯРШАЕ ЎБОРКУ ЎРАДЖАЮ

На гэты факт звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў гэты рэгіён, перадае БЕЛТА.

Паводле слоў губернатара Магілёўскай вобласці Пятра Рудніка, у рэгіёне ўбрана 98 працэнтаў плошчы, застанецца ўбраць толькі зернебабовыя культуры.

Прэзідэнт адзначыў, што вобласць у гэтым годзе дэманструе як высокія тэмпы ўборкі, так і добрую ўраджайнасць. Па стану на раніцу 16 жніўня Магілёўская вобласць намалаціла 1,1 млн.т збожжа. Паводле слоў Пятра Рудніка, чакаецца, што ўраджай збожжавых у вобласці складзе 1,13 млн.т збожжа і 250 тыс.т кукурузы.

«Я, шчыра кажучы, сумняваўся, што такое сапраўды рэальна ў вобласці. Але я яшчэ да пачатку ўборкі гаварыў, што калі ты нармальна арганізуеш, то будзеш мець збожжа. Так яно і атрымалася. Таму што на полі было вельмі добрае збожжа. Малайчына ў гэтым плане. Калі, вядома, выцягнеш яшчэ і прамысловасць так, як намечана, тады можна лічыць, што Руднік адбыўся як кіраўнік. Таму што гэта не просты год, гэта паказчык работы для любога губернатара», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Пятра Рудніка.

Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама тэму імпарту піваварнага ячменю ў Беларусі. Ён папярэдзіў, што ніводная тона піваварнага ячменю не павінна быць імпартавана ў краіну. «Мы нездарма ўклалі такія грошы ў праграму нарыхтоўкі піваварнага ячменю. Да таго ж у гэтым годзе ён нядрэнны», — сказаў Прэзідэнт.

БЫХАЎСКІЯ НАДЗЕЙКІ

Узорны дзіцячы танцавальны ансамбль «Надзейка» Быхаўскай школы мастацтваў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ АЗНАЁМІЎСЯ З РЭАЛІЗАЦЫЯЙ ІНВЕСТПРАЕКТАЎ У ААТ «БЕЛШЫНА»

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч азнаёміўся ўчора з рэалізацыяй інвестыцыйных праектаў у ААТ «Белшына» ў рамках рабочай паездкі ў Магілёўскую і Гомельскую вобласці, перадае БЕЛТА.

Кіраўнік урада наведаў завод масавых шын (ЗМШ) і завод звышбуйнагабарытных шын (ЗБГШ). Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч звярнуў на ход мадэрнізацыі вытворчасці, рэалізацыю найбольш перспектыўных праектаў, вытворчасць прадукцыі, запатрабаванай і айчыннымі, і замежнымі спажыўцамі.

Самы амбіцыйны праект — стварэнне вытворчасці цэльнаметалакордных (ЦМК) шын радыяльнай канструкцыі з пасадачным дыяметрам 57 і 63 цалі. Гэта будзе садзейнічаць пашырэнню асартыменту і павелічэнню аб'ёму вытворчасці шын для кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю 220-360 т вытворчасці ААТ «БелАЗ», а таксама некаторых замежных вытворцаў. Як адзначыў намеснік генеральнага дырэктара па якасці ААТ «Белшына» Алег Куракін, з тысячы шынных прадпрыемстваў свету толькі тры гіганты маюць заслужаны поспех у гэтай справе — Michelin, Bridgestone, Goodyear.

У сувязі з абнаўленнем парку легкавых аўтамабіляў у рэспубліцы і ростам выкарыстання шын з пасадачным дыяметрам ад 16 да 20 цаль у ААТ «Белшына» вядзецца распрацоўка праекта па вытворчасці шын для легкавых аўтамабіляў, а таксама для красовераў і пазадарожнікаў з пасадачным дыяметрам да 20 цаль са зніжаным профілем самой шыны (з аб'ёмам вытворчасці 1,4 млн штук у год).

■ Курсавая розніца

КРЫШЫЦЬ БУРАКІ НА АБОДВА БАКІ...

Гэта, здаецца мне, галоўны прынцып функцыянавання сусветнага валютнага рынку, бо ніхто не дазволіць перамагчы нейкай пэўнай грашовай адзінцы. Падтрыманне прыкладна на адным узроўні курсаў асноўных валют то з вялікімі скачкамі, то з маруднымі рухамі — любімы занятак фінансавых гульцоў. Еўра і долар ізноў пачалі таптацца на вузкім п'едэстале, змагаючыся за першае месца.

Зразумела, што гэтаму спрыяе і незразумеласць рэальнага стану найбуйнейшых эканомік. Навыперадкі яны паказваюць свае дасягненні. Дакладна зразумела толькі адно: як бы там ні было, эканомікі працуюць і паказваюць хоць якія-небудзь вынікі. Аднак у каго яны лепшыя, а ў каго горшыя — высветліць немагчыма. Тут, хутчэй, філасофскае пытанне, чым эканамічнае. Так ці інакш, атрымліваецца, што ў найбліжэйшы час нейкіх значных зрухаў на валютным рынку не прадбачыцца. Хутчэй за ўсё, да верасня, калі будуць вырашаць пытанне пра магчымае зніжэнне працэнтнай стаўкі Еўрапейскага Цэнтрабанка і таксама верагоднае зварочванне праграмы падтрымкі эканомікі Федэральнай рэзервовай службы ЗША.

Беларусы таксама пакуль могуць пачуваць сябе спакойна. Бо, відаць, перыяд нечаканага павышэння курсаў замежных валют прайшоў. За апошні тыдзень долар падаражэў на 20 рублёў (плюс 0,2%) да 8920. Еўра застаўся (пасля зніжэння і падняцця) на ранейшым узроўні — 11910. Расійскі рубель каштуе 270 беларускіх рублёў пасля зніжэння на 1 грашовую адзінку (мінус 0,4%).

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Шпацыр па Камароўцы

ГРЫБЫ «ПАХАВАЛІСЯ», СВІНІНА КАШТУЕ АМАЛЬ ЯК КУРЫЦА

Парушыўшы традыцыю «пошуку навін» найперш на адкрытых радах сталічнага Камароўскага рынку, карэспандэнт «Звязды» спачатку накіравалася ў крыты рынак, дзе прыцанілася да свініны...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Прадаўцы, як заўжды, актыўна заклікаюць і абяцаюць выбраць самы лепшы кавалак.

— Што вы, свініна ў нас не патаннела! — амаль з дакорам намагаецца ўпэўніць мяне адна з прадаўцоў. Пачынаю разглядваць цэннікі на мяса. На многіх з іх пазначаны не нейкі адзін пэўны кошт, як заўсёды было дагэтуль, а адразу дзве лічбы: напрыклад, калі вырашыце гатаваць нешта з шыйнага кавалка, будзьце гатовы аддаць ад 76 да 85 тысяч рублёў за кілаграм.

— Гэта максімальныя і мінімальныя цэны, па якіх мы можам прадаваць мяса, — патлумачыла прадавец. — Але 85 тысяч каштаваць не будзе, не хвалюйцеся. Вам за 80 аддам, — раскрыла яна апошнія карты ўсёй гэтай «коштавай палітыкі». Як яна вызначала ўзровень маёй плацежаздольнасці, застаецца толькі здагадвацца.

На іншыя віды мяса цэны наступныя: кавалак паляндвіцы абыдзецца ў суму ад 68 да 78 тысяч рублёў, за кілаграм свінога кумпяку на Камароўцы давядзецца заплаціць ад 58 да 65 тысяч рублёў. За свежае сала ўвогуле просяць нейкія «смешныя грошы»: ад 10 да 15 тысяч рублёў за кілаграм.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН:

«Па нашых звестках, цяпер на курортах Егіпта знаходзіцца каля тысячы беларускіх грамадзян. Звестак аб тым, што каму-небудзь з іх пагражае непасрэдная небяспека, няма. Тым, хто ўжо набыў пуцёўкі на адпачынак у Егіпет, рэкамендуецца ў мэтах уласнай бяспекі ўстрымацца ад паездкі. У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, у выпадку умоў, якія пагражаюць здароўю і жыццю турыстаў, тураператары ў абавязковым парадку павінны кампенсаваць кошт паездкі. У выпадку іх адмовы кліент павінен звяртацца ў суд. Кансультацыю па спрэчных пытаннях можа даць таксама Міністэрства спорту і турызму».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.08.2013 г.

Долар ЗША	8920,00	▲
Еўра	11932,42	▲
Рас. руб.	270,00	■
Укр. грыўня	1098,25	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 24°
Віцебск	+ 22°
Гомель	+ 24°
Гродна	+ 24°
Магілёў	+ 22°
Мінск	+ 23°

КОРАТКА

Амерыканскае выданне «Flavorwire» ўключыла Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў рэйтынг фантастычных архітэктурных работ (твораў, якія вельмі натуральна выглядалі б у фантастычных фільмах). У рэйтынгу, у які ўключаны 20 работ, яна займае 11-е месца.

Запраўка для электрамабіляў з'явіцца ў Мінску да канца 2013 года, паведамілі ў «Беларуснафце». Пакуль што гаворка ідзе аб устаноўцы спецыяльнага абсталявання на трох існуючых аўтазаправачных станцыях фірменнай сеткі «Беларуснафта» — у Мінску і Гомелі.

У Бабруйску пры будаўніцтве гаража ў спажывецкім гаражна-будаўнічым кааператыве абрынуліся ўнутр тры бетонныя пліты (1х6 м кожная). Гараж сваімі сіламі будавалі двое мужчын. Адзін з іх здолеў самастойна выбрацца з-пад пліт, другі загінуў пад завалам. Работы ажыццяўляліся без спецадзення і будаўнічых касак.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ВЫРАШЫЛА НЕ ЭВАКУІРАВАЦЬ СВАІХ ТУРЫСТАЎ, АЛЕ ТУРЫ НЕ ПРАДАЕ

Расія вырашыла не эвакуіраваць сваіх грамадзян з Егіпта. Па інфармацыі расійскага саюза туріндустрыі, цяпер на адпачынку ў Егіпце знаходзіцца ад 40 да 60 тыс. расіян. Паводле заяў прадстаўнікоў Асацыяцыі тураператараў Расіі, грамадзяне, якія ўжо набылі пуцёўкі, маюць права вылецець у Егіпет, але гэта вельмі непажадана. Аднак калі тур забраніраваны, але не аплачаны, то, хутчэй за ўсё, турысту будзе прапанаваны іншы напрамак, а ў паездцы ў Егіпет будзе адмоўлена.

У КІЕВЕ КАЛЯ ПАСОЛЬСТВА РФ СПАЛІЛІ РАСІЙСКІ ШАКАЛАД

Каля будынка пасольства РФ у Кіеве прайшла акцыя пратэсту супраць блакіравання Расіяй імпарту ўкраінскіх тавараў, паведамляюць інфармагенцтвы. Мерапрыемства арганізавалі актывісты ўкраінскага камітэта «Наступ». Удзельнікі акцыі заклікалі кіраўніцтва Украіны адрэагаваць на дзеянні Расіі і таксама забараніць увоз расійскай прадукцыі. Падчас акцыі былі дэманстратыўна спалены некаторыя прадукты расійскай вытворчасці, набытыя ў Кіеве. У прыватнасці, упакоўка гарбаты і плітка «Русского шоколада».

У КІТАЙСКІМ ЗААПАРКУ САБАКУ ВЫДАВАЛІ ЗА... ІЛЬВА

У кітайскім заапарку наведвальнікі выявілі падробку: замест ільва ў клетцы знаходзілася вялікая кудлатая сабака пароды тыбецкі масттыф. Падман быў раскрыты, калі жывёла, якая, згодна з надпісам на клетцы, была львом, пачала брахаць. Кіраўніцтва заапарка паспешліва ўбрала сабаку, але мясцовыя гарэзы паспелі высмеяць установу ў інтэрнэце, паведамляюць кітайскія СМІ.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ТЛУСТАЯ РЫБА Ў РАЦЫЁНЕ КАНТРАЛЮЕ АРТРЫТ НЕ ГОРШ ЗА ЛЕКІ

Мінімум адна порцыя тлустай рыбы ў тыдзень зніжае рызыку рэўматоіднага артрыту напалову. Гэта паказалі працяглыя назіранні больш чым за 32 тыс. шведак, перадае BBC. Вядома, што вышэйзгаданы тып рыбы багаты на тлустую кіслату амега-3. Кіслата абараняе мозг і сэрца. Гэта выдатны супрацьзапаленчы агент, а артрыт — запаленчае захворванне.

Такім чынам, падчас эксперыменту жанчыны, якія рэгулярна спажывалі любую рыбу хаця б раз у тыдзень, радзей пакутавалі ад артрыту амаль на траціну. А мінімум адна порцыя тлустай ці чатыры порцыі іншай рыбы скарачалі рызыку на 50%.

Рэўматоідны артрыт уяўляе сабой сістэмнае захворванне злучальнай тканкі. У першую чаргу, пакутуюць дробныя суставы. Хвароба суправаджаецца нясцерпным болем, і сустаў не можа нармальна функцыянаваць. Паралельна з гэтым магчымы праблемы з боку сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, скуры, нервовай сістэмы, органаў зроку, нырак, анемія.

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ ЛЯЎШОЙ?

Наш свет зручны для тых, хто максімальна падобны да іншых. Усім, хто выбіваецца з агульнай масы, жыць бывае цяжэй. «Белыя вароны» вымушаны пастаянна падладжвацца пад умовы, створаныя для пераважнай большасці. З нагоды міжнароднага дня леўшуноў мы пацікавіліся, ці лёгка ім жывецца.

Раман ШАМШОРЫК, майстар спорту па кікбоксінгу, менеджар па рэкламе таварыства «Кажан», г. Гродна:

У нашай сям'і ўсе ляўшы, пачынаючы ад прадзеда і заканчваючы мною. Непераадольныя цяжкасці, звязаныя з гэтым, узнікаюць даволі рэдка. Так, камп'ютарная мышка дакладна не для нас стваралася, але ж не праблема перацягнуць яе на супрацьлеглы бок. Не вельмі зручна трымаць камеру правай рукой, але дзякуючы пастаяннай практыцы спраўляюся. Мабыць, адзіная непераадольная цяжкасць паўстае, калі вучышся карыстацца зброяй. Справа ў тым, што любы аўтамат разлічаны на праварукіх. Чаму? У адваротным выпадку ты рызыкуеш уласным тварам у прамым сэнсе гэтага слова: затвор размесціцца якраз перад тварам, і першая ж гільза трапіць у цябе. Але станоўчыя моманты для ляўшы ёсць таксама. Напрыклад, паводле этыкету відэлец патрэбна трымаць у левай руцэ, што для нас цалкам натуральна. Шмат пераваг маюць ляўшы ў спорце. Калі твой партнёр па кікбоксінгу — праўша, то ён, адпаведна, чакае ад цябе ўдару справа. Праціўнік ставіць абарону на правы бок, а ты лёгка трапляеш у яго злева. Як правіла, тады да перамогі застаецца адзін крок.

Пётр КАЗЛОЎ, студэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, г.Гродна:

Ці лёгка мне? Неяк не вельмі. З самага маленства аловак з маёй левай рукі перакладвалі ў правую. Вось вы вазьміце і напішыце што-небудзь левай рукой. Атрымаецца крыва, ці не так? А потым здзіўляюцца, чаму я пішу, як курыца лапай. Гавораць, д'ябал быў ляўшой. Таму ў кожным з нас ёсць нешта дэманічнае. На вялікае шчасце, эпоха сярэднявечча засталася далёка за спінай і інквізіцыяй сёння нас не запалохаеш. Дарэчы, колькасць такіх, як я, — 5% ад усіх жыхароў планеты. Калі ж сур'ёзна і без драматызму, то ўсё нармальна. Часам нават прыемна: знаёмыя даведваюцца, што я ляўша, і адразу ж пачынаюць лічыць мяне за творчую асобу. Вядома, гэта проста стэрэатып, але самаацэнку павышае.

Маргарыта ДАНЦОВА, кансультант крамы «Свет камп'ютарных тэхналогій», г.Гродна:

Сучасным ляўшам значна прасцей. Вось у часы СССР ім даводзілася не зусім салодка. Каму ж захочацца перавучвацца пад прымусам? Сёння ж кожны мае права на самастойны выбар. Можна завітаць у спецыяльныя сеткавыя крамы, разлічаныя адмыслова на ляўшэй. Звычайна там гандлююць канцтаварамі. Напрыклад, адметнай формы ручкі. Праўшы імі карыстацца не здолеюць. Сапраўды эксклюзіўныя рэчы для творчых людзей. Аднойчы зайшла на сайт пра ляўшэй і для ляўшэй — і здзіўленню майму не было межаў. Сярод нас выявілася добрая палова найлепшых галівудскіх акцёраў, наймацнейшых палітыкаў і вайскоўцаў, безліч філосафаў, мастакоў і музыкантаў. Як жа натхнілі мяне іх імёны! Джым Кэры і Скарлет Ёхансан, Фрыдрых Ніцшэ і Франц Кафка, Леў Талстой і Льюіс Кэрал. Сёння ў Беларусі вельмі цэніцца мысленне нелінейнае, вобразнае, арыгінальнае. Таму быць не падобным на астатніх — гэта цудоўна. Як пісаў Марк Твэн, «калі ты заўважыў, што тваё меркаванне супадае з большасцю, час змяняцца».

Падрыхтавала Маргарыта СІДАР.

■ Сацыяльная абарона

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ? ВАМ АДКАЖА ЮРЫСТ!

Як даведацца нумар сваёй чаргі на сацыяльнае жыллё і ад чаго залежыць хуткасць яе руху? Ці можа наймальнік звольніць маці, якая гадуе дзіця-інваліда? На гэтыя пытанні адказвае юрыст Офіса па правах людзей з інваліднасцю Вольга ТРЫПУЦЕНЬ.

Стаю на чарзе на сацыяльнае жыллё...

Я маю дзіця-інваліда і знаходжуся на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Скажыце, як даведацца нумар сваёй чаргі на сацыяльнае жыллё і ад чаго залежыць хуткасць яе прасоўвання? *(С.В., г. Мінск)*

Базы даных аб грамадзянах, якія знаходзяцца на такім уліку, фарміруюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі, якія ажыццяўляюць улік грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Звесткі аб чарговасці на аснове гэтага ўліку выдаюцца па просьбе грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Для таго каб даведацца нумар чаргі на кватэру, вам лепш за ўсё звярнуцца ў выканкам з пісьмовай просьбай. Каб ваш зварот стаў афіцыйным, зарэгіструйце яго ў выканкаме або адпраўце па пошце з паведамленнем аб уручэнні. Згодна з Законам «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», адказ вам павінны даслаць на працягу месяца.

У мінчан ёсць магчымасць даведацца інфармацыю аб сваёй чарзе на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта па наступнай спасылцы http://minsk.gov.by/ru/och/.

Па пытанні аб'ёмаў будаўніцтва ў вашым раёне рэкамендуем таксама звярнуцца ў свой выканкам (адміністрацыю).

У мяне дзіця-інвалід. Ці могуць мяне звольніць?..

Ці можа наймальнік звольніць мяне, калі майму дзіцяці-інваліду яшчэ не споўнілася пяць гадоў? *(Ірына К., г. Мінск)*

Згодна з арт. 28 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 года № 296-З, скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, адзінокімі маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад трох да чатырнаццаці гадоў (дзяцей- інвалідаў — да васямнаццаці гадоў), не дапускаецца, акрамя выпадкаў ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама ў сувязі з:

— Прагулам (у тым ліку адсутнасцю на працы больш за тры гадзіны на працягу працоўнага дня) без прычын;

— Сістэматычным невыкананнем работнікам без уважлівых прычын абавязкаў, ускладзеных на яго працоўным дагаворам ці правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, калі да работніка раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання;

— З'яўленнем на працы ў стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, а таксама распіццём спіртных напояў, ужываннем наркатычных сродкаў або таксічных рэчываў у працоўны час або па месцы працы;

— Здзяйсненнем па месцы працы крадзяжу маёмасці наймальніка, устаноўленага прысудам суда, які ўступіў у законную сілу, або пастановай органа, у кампетэнцыю якога ўваходзіць накладанне адміністрацыйнага спагнання;

— Аднаразовым грубым парушэннем правілаў аховы працы, якое пацягнула калецтва або смерць іншых работнікаў;

— Аднаразовым грубым парушэннем працоўных абавязкаў (гэта тычыцца пасад кіраўнікоў арганізацыі або адасобленага падраздзялення і яго намеснікаў, галоўных бухгалтараў і яго намеснікаў);

— Зменай уласніка маёмасці арганізацыі (у дачыненні да кіраўніка арганізацыі, яго намеснікаў і галоўнага бухгалтара);

— Парушэннем (без уважлівых прычын парадку і тэрмінаў выплаты заработнай платы і (або) дапамог (гэта тычыцца кіраўніка арганізацыі);

— Здзяйсненнем вінаватых дзеянняў работнікам, які непасрэдна абслугоўвае грашовыя і матэрыяльныя каштоўнасці, калі гэтыя дзеянні з'яўляюцца падставай для страты даверу да яго з боку наймальніка;

— Здзяйсненнем работнікам, які выконвае выхаваўчыя функцыі, амаральнага ўчынку, несумяшчальнага з працягам гэтай працы.

Пры гэтым у адпаведнасці з п. 22 Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 2001 г. № 2 «Аб некаторых пытаннях прымянення судамі заканадаўства аб працы» адзінокай маці лічыцца жанчына, якая нарадзіла дзіця па-за шлюбам, у выпадку, калі звесткі пра бацьку дзіцяці ў актавым запісе аб нараджэнні зроблены ва ўстаноўленым парадку па ўказанні маці.

Такім чынам, вы не можаце быць звольнены па ініцыятыве наймальніка (акрамя вышэй пералічаных выпадкаў):

— Да дасягнення дзіцем 3 гадоў — у любым выпадку;

— Калі ў вас ёсць дзіця ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў (дзяцей-інвалідаў — да 18 гадоў) — у выпадку, калі вы з'яўляецеся адзінокай маці.

Святлана БУСЬКО.

P.S. ***Калі ў вас узніклі нейкія дадатковыя пытанні, вы можаце звяртацца з імі да юрыстаў Офіса па правах людзей з інваліднасцю па тэл. +375 (17) 256-08-29, або па E-mail: info@disright.org***

Кансультацыі бясплатныя.

■

■ У паветры

У БЕЛАРУСЬ ЗМОГУЦЬ ПРЫЙСЦІ ЛОЎКОСТАВЫЯ* КАМПАНІІ

Хутка беларускі парламент будзе ўносіць змены ў чарговы дакумент — Паветраны кодэкс РБ. У сярэдзіне ліпеня дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Уладзімір КОСЦІН паведаміў, што гэты акт пасля перапрацоўкі зменіцца ажно на 80%. Былі анансаваны і канкрэтныя змены.

Адной з галоўных і самых значных паправак у Паветраным кодэксе называюць дазвол на выкарыстанне так званых «невяртальных» квіткоў. Увядзенне падобнай сістэмы можа даволі значна паўплываць на кошт палётаў — кажуць нават пра лічбу ў -30%. Ці могуць тарыфы насамрэч так знізіцца і ці такая ўжо страшная рэч гэтыя «невяртальныя» квіткі? На пытанні адказвае **Ігар ЧАРГІНЕЦ, намеснік гендырэктара кампаніі «Белавія» па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці:**

— Я пачаў бы з таго, што слова «невяртальныя» квіткі вельмі негатыўна ўздзейнічае на кліентаў. Яны пужаюцца, думаюць, што атрымаць свае грошы назад ні ў якім выпадку не змогуць. Але гэта не так. Мы прадаём квіткі нават за год да рэйса. Верагоднасць, што ў чалавека адбудзецца нешта непрадбачанае за гэтыя час, вядома, расце. Калі кліент проста фізічна не можа паляцець (напрыклад, хварэе, ці здараецца нешта падобнае), кампанія без праблем вяртае грошы. Гэтае права пасажыра абараняецца заканадаўствам. «Невяртальны» — гэта квіток, які нельга перанесці на іншы дзень ці час. Бываюць выпадкі, калі людзі за мяжой вучацца, працуюць і дакладную дату вяртання не ведаюць. Ім трэба карыстацца звычайнымі квіткамі, каб у экстраннай сітуацыі змяніць дату пералёту за невялікую даплату. Зусім іншая справа — людзі, якія ведаюць, куды і на які тэрмін яны ляцяць. Ім няма чаго баяцца.

— Як звязаны «невяртальныя» квіткі з лоўкоставымі кампаніямі? Ці варта чакаць рэзкага падзення цаны на ўсе тарыфы пасля прыняцця новага кодэкса?

— Звычайна адна з умоў існавання чыстых лоўкоставых кампаній — гэта магчымасць прадаваць «невяртальныя» квіткі. Вы ж разумееце, такія перавозчыкі працуюць, што называецца, «на тоненькага». Абавязковая ўмова акупнасці — забітыя «пад завязку» самалёты. Магчыма, са з'яўленнем «невяртальных» квіткоў у Беларусь прыйдуць і паўнавартасныя лоўкосты. «Белавія» ж лоўкостам не з'яўляецца, як не з'яўляецца і класічнай авіякампаніяй. Мы паступова пераходзім на гібрыдны тып, які аб'ядноўвае ў сабе рысы як тых, так і другіх. На цэнах гэта адбіваецца пазітыўна: тыя, хто за імі сочыць, могуць пацвердзіць, што нашы квіткі за апошні час патаннелі прыкладна ў 2 разы. Але гэта не значыць, што са з'яўленнем «невяртальных» квіткоў нашы рэйсы раптам стануць каштаваць 30 еўра, як гэта бывае ў паўнавартасных лоўкостаў. Нават усе магчымыя змены мы праводзім паступова, і рэзкіх скачкоў цэн у той ці іншы бок не бывае.

— Ці бачылі вы гатовы праект новага кодэкса?

— Пакуль што не, таму лічу бессэнсоўным каментаваць яго агулам. Магчыма, падчас прыняцця будуць унесены сур'ёзныя праўкі. Але вельмі добра, што пры распрацоўцы звярнуліся да нас і прынялі да ўвагі некаторыя нашы пажаданні. Канчаткова нешта ацэньваць можна будзе толькі пасля зацвярджэння акта.

— Гэтай вясной вы анансавалі распрацоўку новага брэнда кампаніі. Як ідзе праца ў гэтым кірунку? Я заўважыў, што старая шыльда знікла з будынка галоўнага офіса.

— Так, шыльда знікла, але проста таму, што яна старая, а новую яшчэ не павесілі (*смяецца*). Што датычыцца брэнда, то зараз праца трохі затармазілася. Былі праведзены сустрэчы з усімі прэтэндэнтамі — да гэтай працы мы вернемся восенню. Зараз жа сезон, можа банальна не хапаць часу. Якраз сёння мы нарэшце вырашылі яшчэ адну праблему: чэшскія авіялініі раптам змянілі расклад сваіх рэйсаў у Мінск у сярэдзіне лета. Звычайна так не робіцца, бо з-за разыходжання ў некаторыя дні рэйсаў з беларускай сталіцы ў Прагу і назад не было. Мы ліквідавалі гэты прабел сваімі сіламі, павялічыўшы колькасць уласных рэйсаў. Якраз сёння атрымалі на гэта дазвол ад чэхаў. Таму летам можа быць не да брэнда.

— Ці не ўваходзіць у праект брэндзінгу больш актыўнае выкарыстанне беларускай мовы?

— У нас і зараз ёсць паведамленні па-беларуску. Аднойчы мы паспрабавалі перакласці ўсё на родную мову — атрымалі скаргі ад пасажыраў. Пасля зрабілі наадварот, усё па-руску, — такі самы вынік, людзі скардзяцца. Таму мы ўвесь час у пошуку кампрамісу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

**лоўкосты (ад англ. low-cost — танны) — або бюджэтныя авіякампаніі — кампаніі, якія прапаноўваюць кліентам вельмі нізкія цэны за пералёты ў абмен на адмову ад традыцыйнага авіясэрвісу.*

Ёсць мільённы пасажыр у 2013-м!

Колькасць пасажыраў, перавезеных Нацыянальнай авіякампаніяй «Белавія» ў гэтым годзе, дасягнула аднаго мільёна чалавек, перадае БЕЛТА. Намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці РУП «Нацыянальная авіякампанія «Белавія» Ігар Чаргінец уручыў мільённаму пасажыру сертыфікат на два авіябілеты на рэгулярныя рэйсы па любым напрамку маршрутнай сеткі авіякампаніі. Шчаслівчыкам стала маладая беларуска, пасажырка рэйса Мінск — Лондан, якая накіроўваецца на вучобу. Таксама ў якасці бонуса замест эканомкласа дзяўчына паляцела бізнес-класам.

■ Памяць

БЕЛЫ ПТАХ, ЯКІ АДЛЯЦЕЎ...

Спасаўка — шчодры час года... Шчодры мёдам і садавіной, шчодры цеплынёй сонца... Вось-вось пазалацее лістота... Прыгожая пара. Некалі амаль у гэтую пару для Пушкіна пачыналася Болдзінская восень... А для многіх з нас, беларускіх журналістаў, час сумны, бо вось днямі сабраліся на жалобную сустрэчу на Паўночных могілках: сёння год, як няма сярод нас на гэтым свеце нашага сябра, для многіх іншых калег — настаўніка і кіраўніка, Уладзіміра Бельскага — Валодзі. Былога шматгадовага галоўнага рэдактара сёння звяздоўскай «Чырвонкі», старшыні Дзяржкамдруку, аднаго з першых надзвычайных і паўнамоцных паслоў нашай краіны ў Чэхіі і Славакіі, пазней — галоўнага рэдактара газеты «Сям'я» і банкаўскага аналітыка, палітолага, пісьменніка і паэта, сябра і светлага-светлага чалавека... Колькі там яшчэ нават да той пенсіі было — нейкай нібыта мяжы — а чалавека год як няма з намі...

У нас, журфакаўцаў БДУ імя Леніна выпуску 1981-га, ён быў старастам курса. Пасля войска і падрыхтоўчага аддзялення каму, як не яму, было наканавана вазіць нас па «бульбах» і будатрадах, арганізоўваць у інтэрнатах на Кастрычніцкай дыскатэкі са святламузыкай, пластмасавыя пласцінкі для ліхтароў якой мы разам з ім шукалі па навакольных сметніках... Не фізікі-хімікі, а менавіта журналісты першымі зрабілі такі цуд для нашых інтэрнатаўскіх суботніх вечарын...

Рэдактарства «Чырвонкай» прыпала для яго на няпросты канец 90-х і доўжылася да 1996-га. Газета была вялікатыражная, цікавая, а на «чырвонкаўскім» паверсе Дома друку можна было папросту пагаварыць з Міколам Федзюковічам і Валерыем Івановым, Анатолем Ярмоленкам і з музыкантамі толькі што народжаных тады многіх беларускіх гуртоў, са славутымі літаратарамі...

Народны артыст Беларусі, кампазітар Валерый Іваноў:

— Самыя светлыя ўспаміны пра гэтага чалавека і самая адчайная туга па ім... Вельмі мала людзей, якія маглі столькі часу аддаваць сябрам... Мне Валодзя прысвяціў паэму — вось узяў і напісаў... Былі мы адзін у аднаго і ў кватэрах, і ў бацькоўскіх дамах... А ён жа са знакамітых калінкавіцкіх Юравічаў... І я пачуваўся там як дома, бо з ім было цёпла. Я не люблю такіх слоў — «заўчасна пайшоў», «мог бы яшчэ жыць»... Жыві ты 50 або 100 гадоў... Але калі адыходзіць Асоба — гэта страшэнна сумна і ў жыцці вельмі не хапае нечага вялікага і істотнага. Я дакладна ведаю: пры такіх людзях, як ён, для многіх з нас жыццё робіцца куды лепшым...

...А спяваць Валодзя, будучы студэнтам, любіў вясковыя прыпеўкі, і, напэўна, найлепшую беларускую песню пра завушніцы....

Пятро РАМАНЧУК

■

«БЕЛАРУСЫ» — СВАЕ І НА ВЕНГЕРСКІХ НІВАХ

Мінскі трактарны завод і надалей адным з прыярытэтных кірункаў будзе лічыць пашырэнне продажаў сваёй тэхнікі ў Еўропе. Пра гэта было заяўлена на нарадзе кіраўніцтва «МТЗ», якая прайшла ў Венгрыі з удзелам беларускіх дыпламатаў на базе кампаніі «Беларус Трактар».

Кампанія «Беларус Трактар» — гэта 100-працэнтная ўласнасць МТЗ, які даўно і паспяхова ажыццяўляе продаж нашых трактароў розных мадыфікацый на венгерскім рынку, прычым мае ў горадзе Хорт, што паблізу Будапешта, уласны выставачна-складскі цэнтр. Цяпер менавіта «Беларусы» з'яўляюцца адной з вядучых пазіцый беларускага экспарту ў Венгрыю. Летась у гэтай краіне прададзена 900 адзінак тэхнікі на суму 16 млн долараў, сёлета — ужо 690 (на суму каля 13,5 млн).

Кіраўніцтвам МТЗ якраз і вывучаўся станоўчы вопыт дзейнасці кампаніі «Беларус Трактар» на венгерскім рынку. Менавіта з улікам гэтага вопыту абмеркаваны стратэгія павышэння эфектыўнасці і пашырэння продажаў беларускіх трактароў у Еўропе, пытанні забеспячэння сэрвіснага абслугоўвання тэхнікі, паляпшэння яе якасці ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі, а таксама далейшае ўдасканаленне дылерскай сеткі ў рэгіёне.

Між тым, па звестках Белстата, у першым паўгоддзі ў нас выраблена 34,4 тыс. трактароў для сельскай і лясной гаспадаркі, што складае 90,4% да ўзроўню мінулага года. Экспарт трактароў склаў у студзені—маі 20066 адзінак тэхнікі на 377 млн долараў.

Такім чынам, калі часам гаворыцца пра значныя складскія запасы, прыклад венгерскага прадстаўніцтва МТЗ сведчыць пра тое, што наша тэхніка па-ранейшаму запатрабавана. Гандляваць вучыцца нікому і ніколі не позна...

Пятро РАМАНЧУК.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У ШКОЛЬНЫМ РАСКЛАДЗЕ БУДУЦЬ ТРЫ ГАДЗІНЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

У новым навучальным годзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на заняткі фізічнай культурай і спортам будзе адводзіцца 3 гадзіны ў тыдзень. Такім чынам у галоўным адукацыйным ведамстве збіраюцца кампенсаваць дэфіцыт рухальнай актыўнасці, характэрны для абсалютнай большасці школьнікаў.

Два вучэбныя ўрокі будуць праводзіцца ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам. Трэцяя «Гадзіна здароўя і спорту» таксама становіцца абавязковай і ўносіцца ў расклад вучэбных заняткаў.

— Да правядзення «Гадзіны здароўя і спорту» будуць прад'яўляцца такія ж арганізацыйныя, педагагічныя і санітарна-гігіенічныя патрабаванні, як і да правядзення ўрокаў фізічнай культуры, — патлумачылі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве. — «Гадзіна здароўя і спорту» з'яўляецца працягам урокаў фізічнай культуры і шчыльна звязана з імі агульнымі задачамі, сродкамі навучання і метадамі арганізацыі заняткаў. Падчас «Гадзіны здароўя і спорту» навучэнцы атэстуюцца на агульных падставах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У БЫХАВЕ ЎШАНУЮЦЬ ПАМЯЦЬ БАРЫСА СТРАЛЬЦОВА

На будынку Быхаўскага раённага цэнтра культуры, абноўленага да Дня беларускага пісьменства, з'явіцца мемарыяльная дошка, прысвечаная ўраджэнцу Быхаўшчыны, заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Барысу Васільевічу Стральцову.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Імя гэтага вядомага беларускага журналіста, выкладчыка і пісьменніка таксама будзе прысвоена Быхаўскай раённай цэнтральнай бібліятэцы.

— Гэта слушная ініцыятыва абласнога аддзялення Беларускага саюза журналістаў, — патлумачыў першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч. — Больш за тое, ніводнай бюджэтнай капейкі на мемарыяльную дошку не выдаткавана: сродкі на яе сабралі самі журналісты рэгіёна.

Урачыстае адкрыццё дошкі памяці Барыса Стральцова ў Быхаве запланавана на 31 жніўня, калі пачнуцца мерапрыемствы да XX юбілейнага Дня беларускага пісьменства.

Ілона ІВАНОВА.

ЗНОЎ КАНТРАБАНДНЫЯ ШТЫК-НАЖЫ

Адзін баранавіцкі калекцыянер не так даўно затрымліваўся брэсцкай мытняй як парушальнік правілаў правозу. Два месяцы таму ён перавозіў праз мяжу 12 штык-нажоў і адну шаблю. Тавар тады канфіскавалі.

На гэтым тыдні ён зноў вёз з Польшчы штык-нажы да розных мадыфікацый аўтамата Калашнікава і керамічны посуд перыяду Другой сусветнай вайны. А ў мытнай дэкларацыі ўказаў, што вязе ўмывальнік коштам 75 долараў. Але спецыялісты зазірнулі ў нішу для запаснога кола. Там знаходзілася сумка, у якой былі ўпакаваны 13 штык-нажоў, а таксама прадметы посуду.

Яна СВЕТАВА.

РАССЛЕДАВАННЕ БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНА

Расследаванне справы ў дачыненні да былога дырэктара Белдзяржцырка прадоўжана. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.

«Следчы камітэт працягвае расследаванне па гэтай крымінальнай справе. Тэрмін расследавання прадоўжаны да кастрычніка», — адзначылі ў СК.

Нагадаем, што крымінальную справу ў дачыненні да Таццяны Бандарчук распачала Генеральная пракуратура Беларусі па матэрыялах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС і КДК. Аб тым, што былы дырэктар Белдзяржцырка падазраецца ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі (ч.3 арт.424 КК), стала вядома яшчэ ў пачатку чэрвеня. Але ўжо ў канцы таго месяца на прэс-канферэнцыі намеснік генпракурора Аляксей Стук адзначыў, што ў поле зроку следства патрапілі новыя эпізоды дзейнасці падазраванай. Сярод іх бясплатная рэалізацыя квіткоў на прадстаўленні для асобных людзей, незаконнае страхаванне замежных гастралёраў, выплата прэміяльных артыстам, якія знаходзіліся на прадстаўленні за мяжой.

Надзея ПАЎЛАВА.

СЭНС ДЭМАКРАТЫІ: УРОКІ «АРАБСКАЙ ВЯСНЫ»

Вясной 2011 года прагрэсіўная грамадскасць многіх краін свету пляскала ў далоні так званай «арабскай вясне». Але ўжо праз некалькі месяцаў аказалася, што былыя прыгнечаныя нічым не лепшыя за былых прыгнятальнікаў

У сухім астатку

Па-першае, аказалася, што ўсе змагары за свабоду ў арабскім свеце — запар найміты, члены «Аль-Каіды» і ісламісты. Таму сёння народы Туніса, Егіпта і Сірыі змагаюцца менавіта супраць радыкальных ісламістаў, якія прыйшлі да ўлады. А ў Лівіі проста ідзе ўзаемная «рубка» зляцеўшых са шпулек шматлікіх плямёнаў.

Па-другое, аказалася, што змагары за свабоду ніколі не былі і ўжо тым больш цяпер не знаходзяцца ў большасці ў сваіх краінах. Тое, што ў Лівіі і Сірыі першапачаткова дзейнічалі, у асноўным, замежныя найміты, якія падтрымліваюцца манархіямі Персідскага заліва, для многіх было відавочна першапачаткова. Сёння ж відавочна, што і ў Егіпце, і ў Тунісе тыя ж сілы проста змаглі асядлаць масавую незадаволенасць карупцыяй і шматгадовай недзеяздольнасцю кіраўніцтва гэтых дзвюх краін.

Па-трэцяе (і гэта, мабыць, галоўнае), войны ў Лівіі і Сірыі, палітычныя ўзрушэнні ў Егіпце і Тунісе і ўзмоцненая гульня ў дэмакратыю пад воплескі «міжнароднай супольнасці» прывялі не да вырашэння праблем развіцця гэтых краін, а да іх катастрафічнага пагаршэння. Нават цяжка сказаць, што горш: тое, што з-за канфліктаў аказаліся разбуранымі многія інфраструктуры, як у Лівіі ці Сірыі, або тое, што з-за гульняў у дэмакратыю быў страчаны каштоўны час для вырашэння самых надзённых, неадкладных эканамічных праблем (як у Тунісе або Егіпце). Бо свет паступова, але непазбежна ўцягваецца ў другую фазу глабальнага крызісу, якая будзе значна больш разбуральнай, чым першая. Адпаведна, ствараць і рэалізоўваць праграму эканамічнага развіцця ў гэтых умовах будзе ўжо значна складаней, чым у перыяд з 2011-га па 2013 год.

Егіпецкі прыклад

Возьмем Егіпет. Дэфіцыт бюджэту гэтай краіны расце з моманту змены ўлады ў 2011 годзе. У сакавіку 2013-га Міністэрства фінансаў заявіла, што дэфіцыт бюджэту дасягнуў 10,6% ВУП за першыя дзесяць месяцаў фінансавага года 2012-2013: 26,5 мільярда долараў, у параўнанні з 16,8 мільярда за перыяд з ліпеня 2011 г. па красавік 2012 г. У 2012 годзе паступленні ў бюджэт склалі 50 мільярдаў, а выдаткі — 77 мільярдаў долараў.

Праблема, аднак, у тым, што пытанні эканамічнага развіцця краіны за гэты час не толькі не вырашаліся, але і не ставіліся. У тым ліку і цяперашні пераварот, ажыццёўлены стомленымі ад «Братоў-мусульман» егіпцянамі з ваеннымі на чале, быў выключна палітычным, паліттэхналагічным дзеяннем, разборкай на прадмет таго, каму павінна належаць улада. Патрэбы ж краіны на гэтым фоне нікога не цікавілі і не цікавяць: і ваенныя, і ісламісты хочуць крэдытаў МВФ і папулісцкіх хуткіх рашэнняў.

Што будзе адбывацца далей?

Ваенныя, якія зараз перамаглі, зноў пачнуць набіваць кішэні і ездзіць па міжнародных форумах, шукаючы падтрымкі. Але галодныя егіпцяне зноў не атрымаюць ніякіх перспектыў і праз некалькі дзясяткаў месяцаў падтрымаюць падчас чарговага путчу чарговых радыкалаў. І так можа працягвацца да бясконцасці.

І гэта — пры тым, што Егіпет багаты на рэсурсы (нафта — не выключэнне). Мае шматлікае насельніцтва з праслойкай нядрэнна адукаваных спецыялістаў і валодае ўсімі магчымасцямі для таго, каб выбудоўваць і развіваць магутны ўнутраны рынак. Існуюць сур'ёзныя напрацоўкі аж да тэхнічных праектаў таго, якім чынам можна вырашыць водную, харчовую праблему — спадчына перыяду актыўнага супрацоўніцтва Егіпта з СССР. Накід праграмы эканамічнага развіцця, якая дазваляе выкарыстоўваць гэты зачын, быў нядаўна апублікаваны Хусейнам Аскары, старшынёй Еўрапейскай працоўнай партыі ў Швецыі ў амерыканскім часопісе Executive Intelligence Review.

Аднак усё гэта не вельмі цікава цяперашнім егіпецкім кіраўнікам і яшчэ менш цікава прадстаўнікам міжнароднай супольнасці.

Што ж такое дэмакратыя?

Гледзячы на гэты сумны прамежкавы вынік «арабскай вясны», міжволі зноў задумваешся: а што ж такое дэмакратыя? Выкананне працэдур? Адпаведнасць міжнародным стандартам? Сяброўства з ЗША і Вялікабрытаніяй?

Мабыць, дэмакратыя — гэта такі стан грамадства, у якім народ можа прымусіць сваю эліту вырашаць агульназначныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця. А такая дэмакратыя сёння становіцца неактуальнай і нецікавай. Як пісаў нядаўна на старонках «Звязды» Сяргей Кізіма, дэмакратыя ў свеце заканчваецца.

Беларусь з яе ўнікальным вопытам народаўладдзя і працы кіраўніцтва дзяржавы ў інтарэсах большасці насельніцтва з'яўляецца выдатным прыкладам сапраўднай дэмакратыі. І нездарма менавіта ў нашай краіне была зроблена першая, няўдалая спроба гвалтоўнай змены ўлады — 19 снежня 2010 года, якая стала прадмовай да «арабскай вясны».

Аднак сёння мы стаім перад цэлым шэрагам выклікаў (эканамічных, палітычных, геапалітычных), якія пагражаюць гэтым заваёвам. Як ва ўмовах глабальнага крызісу, у цэнтры аднаго з самых нестабільных рэгіёнаў свету захаваць і прымножыць здабытак беларускага народаўладдзя? Важнасць адказу на гэтае пытанне сёння цяжка пераацаніць.

Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык.

З ПАЕЗДКАЙ У ЕГІПЕТ ЛЕПШ ПАЧАКАЦЬ

Міністэрства замежных спраў рэкамендуе беларускім грамадзянам, якія знаходзяцца на адпачынку ў Егіпце, устрымацца ад паездак за межы курортных зон. Таксама ў сувязі з абвастрэннем ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў гэтай краіне нашым суайчыннікам рэкамендавана выключыць наведванне Каіра і іншых буйных гарадоў, пазбягаць месцаў масавага знаходжання людзей, за межамі атэляў праяўляць павышаную абачлівасць. Турыстам, якія знаходзяцца ў раёнах дзеяння каменданцкай гадзіны — у прыватнасці, на курортах Паўднёвага Сіная (гарады Шарм эль Шэйх, Дахаб, Нувейба і Таба), не трэба пакідаць тэрыторыі атэляў з 19 да 6 гадзін. «У гэтых умовах грамадзянам Беларусі, якія плануюць свой адпачынак у рэгіёне, рэкамендавана ўстрымацца ад наведвання Егіпта да нармалізацыі сітуацыі ў краіне».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению частного предприятия «Торговый дом «Гомельстекло-Витебск» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

здания склада ватина,

об. пл. 578,9 кв.м, инвентарный номер 200/С-53799, расположенного по адресу: **г. Витебск, ул. Академика Павлова, 42 А.**

Начальная цена с НДС – 900 402 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,2387 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования; ограничение: 0,0069 га – охранная зона линий электропередачи до 1000 В; 0,0219 га – санитарно-защитная полоса водовода; 0,0207 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0225 га – охранная зона тепловых сетей; 0,2374 га – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (р. Западная Двина)).

Обременения – частичная аренда.

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **01.10.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.09.2013** до 17.00 по указанному адресу

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

ОАО «Гомельхлебопродукт»
ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Гомельхлебопродукт» 30 августа 2013 года.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О распределении прибыли Общества и выплате дивидендов за 2012 год.

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, актовый зал ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел. (8 0232) 72 59 40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 400010980 *Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».*

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 1634132 **считать недействительным.** УНП 101883943

■ Шляхамі Першай сусветнай

Вандроўкі па лініі фронту

Калі вядомы журналіст і фатограф Уладзімір Багданаў калісьці пачаў здымаць беларускія краявіды, канкрэтная тэмы не выбіраў. Вандруючы па краіне, фатаграфаваў замкі, касцёлы, цэрквы, сядзібы... І аднойчы заўважыў, што сярод шматлікіх фотаздымкаў — нямала аб'ектаў Першай сусветнай вайны. Тады гэтая глабальная, сусветнага значэння тэма мала кім была даследавана. «Замалёўваць» гэтую белую пляму ўзяўся ён.

Убачыць «вайну»... з космасу

2004 год. У Нацыянальным гістарычным музеі — выстава Уладзіміра Багданава. На фотаздымках — каля 50 аб'ектаў Першай сусветнай вайны. Нямала за паўгода працы! За 10 гадоў фотограф адшукаў і даследаваў ужо каля тысячы аб'ектаў. Пошукі не спыняюцца і сёння...

— Беларусь — тая тэрыторыя, праз якую, асабліва ў XX стагоддзі, адна за адной прайшлі войны, пакінуўшы пасля сябе значны след, — расказвае Уладзімір Багданаў. — Мы нават уявіць не можам, што валодаем вельмі цікавай і арыгінальнай спадчынай. Калі кажам аб тым, што засталося пасля Першай сусветнай вайны, адразу ж згадваюцца фартыфікацыйныя збудаванні. Іх дастаткова шмат, яны прыкметныя, некаторыя нядрэнна захаваліся.

Лінія фронту была на Беларусі амаль 3 гады. Толькі нямецкіх бетонных укрыццяў — некалькі тысяч. Рускія войскоўцы з бетону амаль нічога не будавалі: на доўгачасовую абарону на сваёй тэрыторыі яны не разлічвалі. Таму ўмацаваных ліній нашага боку амаль не захавалася. Праўда, калі пашанцуе, вандруючы па беларускіх лясах, можна натрапіць на акопы глыбінёй у 2 — 3 метры.

Калі пашанцуе, вандруючы па беларускіх лясах, можна натрапіць на акопы глыбінёй у 2 — 3 метры.

Так з космасу выглядае Мядзел.

беларускіх лясах, можна натрапіць хіба што на былыя акопы рускіх войск.

Града шырынёй у чатыры кіламетры раздзяляе азёры Нарач і Мядзел. Менавіта толькі на гэтым перашыйку падчас некалькіх паездак Уладзімір Багданаў знайшоў амаль 120 нямецкіх бетонных збудаванняў самага рознага прызначэння. Адны з іх захаваліся больш, іншыя — менш. Яны ёсць нават на астраўках, што «выглядаюць» з азёр. Тут жа ўдалося адшукаць і дзясяткі кіламетраў акопаў (як нямецкіх, так і рускіх), ямы ад шматлікіх бліндажоў і зямлянак.

— Дзякуючы такому рэльефу мясцовасці наступствы Першай сусветнай вайны відаць нават з космасу! — сцвярджае фотограф.

Архітэктурныя «ахвяры» Вялікай вайны

Усе памятаюць цудоўны выгляд Крэўскага замка. Многія знаёмы з яго гісторыяй. І мала хто ведае, што ён таксама лічыцца помнікам Першай сусветнай вайны: ад рускай артылерыі замак пацярпеў значна больш, чым ад набегаў мангола-татар і варожых князёў.

У сакавіку 1918 года ў Брэсцкай крэпасці быў падпісаны Брэсцкі мір, які паклаў канец вайне на Усходнім фронце. Таму і гэты славуты аб'ект архітэктурнай спадчыны звязаны з эпохай Вялікай вайны. Як і Нясвіжскі палац, што якраз знаходзіўся непадалёку ад фронту. Радзівілы арганізавалі там рускі шпіталь. Гісторыкі сцвярджаюць, што дзякуючы гэтай акалічнасці і ўдалося захаваць шэдэўр беларускага дойлідства.

А ў Магілёве захаваліся дамы, дзе размяшчалася царская Стаўка. У адным з іх бываў апошні рускі імператар Мікалай. Дзейнічае і вакзал, каля якога рэвалюцыянерамі быў забіты генерал Духонін, апошні галоўнакамандуючы рускай арміяй.

Фотаздымак брацкай магілы ў Залессі, зроблены ваенным урачом рускай арміі Аляксандрам Зусмановічам. 1916 г.

І такіх прыкладаў шмат. Руіны некаторых храмаў і сёння нагадваюць пра наступствы Першай сусветнай вайны. Яны не такія вядомыя, але не менш унікальныя. Цудоўны Суткаўскі манастыр стаяў бы зараз у Наваспаску, што на Смаргоншчыне, цэрквы — пад Карэлічамі і ў Івашкавічах, што ў Зэльвенскім раёне.

Затое ў Ашмянскім раёне ў ідэальным стане захавалася гаўптвахта. Гэта, вядома, не аб'ект архітэктуры, але помнікам мінулага стагоддзя яе ўсё-такі можна лічыць. «Дзейнічае» былая гаўптвахта і зараз — мясцовы жыхар прыстасаваў памяшканне для захоўвання бульбы. Дзіўны беларускі народ!

Там, дзе сняцца вечныя сны

Асобная тэма, на якую выйшаў Уладзімір Багданаў, — могілкі, брацкія магілы, месцы пахаванняў часоў Першай сусветнай вайны.

— Трэба ўяўляць сабе, што вайсковыя могілкі таго часу вельмі адрозніваюцца ад пахаванняў Другой сусветнай, — перакананы мой суразмоўца. — Гэта звязана з тым, што раней было іншае стаўленне да супрацьлеглага боку: вораг ворагам, але калі ён загінуў, яго трэба пахаваць па-чалавечы. Таму пераважная частка могілак часоў Першай сусветнай вайны былі змешанымі.

Сёння ў Беларусі толькі арыгінальных помнікаў на вайсковых могілках тых гадоў захавалася больш за 60. Амаль усе яны пабудаваны немцамі. Справа ў тым, што праціўнікі рабілі помнікі з каменю, а крыжы — з бетону. Рускі бок, на жаль, адкладваў гэтую справу на потым: лічылі, што яны на сваёй зямлі, яшчэ ўсё паспеюць. Зразумела, тыя драўляныя крыжы, якімі яны абазначвацца на могілках няпроста. Фатаграфу ўдалося зразумець толькі тое, што царква стаяла дзесьці ў цэнтры. Яшчэ ён даведаўся, што тут знаходзіцца магіла медсястры санітарнага цягніка, якая загінула ў 1917 годзе. На помніку павінны былі быць адлюстраваны чэрап і косці.

Паблукаўшы на могілках дзесьці з паўгадзіны, даследчык не мог ні за што зачапіцца. Ужо сыходзячы, напаткаў пажылога мужчыну. Для чыстага сумлення Уладзімір Багданаў паказаў яму фотаздымак. І трэба ж, які поспех! Мясцовы жыхар не толькі ведаў пра царкву, а нават бачыў яе, калі быў малым.

Так гэтае месца выглядае сёння. Драўлянай царквы ўжо няма, не відаць і былога пахавання.

лі месцы пахаванняў, страчаны. Як і магілы нашых суайчыннікаў. І хутчэй за ўсё, назаўсёды.

Праўда, некаторыя з іх фатографу ўсё ж такі ўдаецца знаходзіць. Адны «адрасы» ведае сам, другія падказвае літаратура, трэція — людзі. У пошуку асабліва карысныя карты 1920—1930-х гадоў, якія сёння існуюць у шырокім доступе. Прычым не толькі рускія, але і нямецкія. Крыніца інфармацыі — і палкавыя кнігі, якія пасля вайны выпускалі немцы. Асабліва каштоўныя іх фотаальбомы: на кожным фотаздымку — подпіс, дзе пазначаны людзі, населены пункт і год. Дарэчы, толькі па нямецкіх фотаздымках можна вывучаць гісторыю Першай сусветнай вайны: немцы рабілі іх усюды, дзе былі. Чаго не скажаш пра рускіх...

Апошняя вандроўка і новыя адкрыцці

У гэтым даследаванні Уладзіміру Багданаву дапамог фотаздымак ваеннага ўрача рускай арміі Аляксандра Зусмановіча, які знайшоў у інтэрнэце. Пад ім подпіс: «Брацкая магіла загінуўшых ад задушлівых газаў, пушчаных праціўнікам супраць ст. Залессе. 1916 г.» На здымку — крыж на вялікай свежай магіле, якая знаходзіцца побач з драўлянай царквой.

— Тэлефаную мясцовым краязнаўцам, з якімі я ўжо неаднойчы працаваў, — успамінае Уладзімір Анатольевіч. — Яны пацвярджаюць, што была такая царква, але яна даўно згарэла. У 1967 годзе, на Вялікдзень, старшыня калгаса разам са сваімі падначаленымі аблілі яе гаручым і падпалілі. Расказвалі, што нават сцяжынка, па якой яны цягалі бензін, палала агнём!

Вызначыць месца брацкай магілы станавілася ўсё складаней. Зразумела, што амаль за 100 гадоў на могілках, дзе нават царква знікла, шмат што змянілася і выглядае ўсё па-іншаму. Нягледзячы на гэта, Уладзімір Багданаў накіраваўся на Смаргоншчыну.

На гэтых могілках ён аказаўся ўпершыню. Прыпаркаваўшы аўтамабіль пры ўваходзе, дастаў раздрукоўку са здымкам Зусмановіча і пайшоў з ёй апытваць людзей, якія працавалі непадалёк. Пагутарыў. Толькі ніхто з іх пра царкву ніколі не чуў. Тым больш, не мог паказаць месца, дзе яна стаяла.

Давялося тэлефанаваць знаёмаму, які ведае гэтыя мясціны. Праўда, асаблівай дапамогі не атрымаў: па тэлефоне сарыентаваць месца, будзе ведаць, што яно ахоўваецца дзяржавай.

Падчас савецкага перыяду і так было нямала страчана: аб'екты фартыфікацыі і месцы пахаванняў узрывалі пасля вайны, знішчалі мэтанакіравана. У некаторых вёсках, якія размяшчаліся ўздоўж лініі фронту, фундаменты калгасных будынкаў і нават хат складаюць не толькі бетонныя фрагменты нямецкіх бліндажоў, а часам і помнікі з ваенных могілак.

Даследчык Першай сусветнай вайны згадаў адну Радаўніцу. Тады ён ехаў на Валожыншчыну — на амаль нікому невядомыя могілкі ў лесе, каб паставіць свечку па загінулых падчас аднаго з баёў. Калі прыехаў, не паверыў вачам: могілкі былі раскапаны літаральна два дні таму. У выніку рабаўнікамі аказаліся мясцовыя хлопцы, якіх хутка знайшлі.

Успамінае Уладзімір Багданаў і тое, як колькі разоў краязнаўцы расказвалі яму пра вялікія нямецкія могілкі ў вёсцы Круплі, што ў Іўеўскім раёне на Гродзеншчыне. Нават паказвалі, дзе яны размяшчаліся. Толькі ніводнага следу ад былых могілак адшукаць так і не ўдалося. Праз некаторы час даследчык выпадкова натрапіў на падборку фотаздымкаў, на якіх была пазначана гэтая вёска і гады.

— Ячэ раз еду ў тыя Круплі, знаходжу мясцовага дзеда, які мне і расказаў, як былі знішчаны нямецкія могілкі. Аднойчы, пасля вайны, адзначаючы свята Перамогі, прыехалі сюды былыя чырвонаармейцы. З дапамогай коней вырвалі дубовыя крыжы, затым іх спалілі... Так і адзначылі свята. Нічым, як варварствам, гэта больш і не назавеш.

Захаваліся ў Беларусі і вельмі шыкоўныя помнікі на нямецкіх могілках. Толькі і тыя ўжо сапсавалі... У скульптуры арла, што стаіць на могілках у вёсцы Пронькі ў Мядзельскім раёне, адбіта галава, прастрэлены крылы. У помніку ў Карабанах, што на Брэстчыне, замест каменнага чалавека засталіся толькі яго ногі. І такіх прыкладаў вельмі шмат.

— Не па-чалавечы гэта, вымяраць стаўленне да могілак ці помнікаў толькі па нацыянальнай прыналежнасці, — лічыць фатограф. — Нельга забываць, што ў Беларусі нямала добраўпарадкаваных немцамі могілак, на якіх пахаваны і рускія салдаты. Напрыклад, на помніку ў вёсцы Невель на Піншчыне на дзвюх мовах напісана: «Друзья и враги смертью объединены». Ёсць нават і такія могілкі, на якіх няма ні аднаго немца, але ўсе славянскія прозвішчы напісаны на іх па-нямецку. Як прыклад — могілкі пад Сновам, што пад Нясвіжам, дзе знаходзіўся рускі лазарэт. Драўляныя крыжы там памянялі на бетонныя ў 1930-я гады, калі гэта была тэрыторыя Заходняй Беларусі, і зроблена ўсё было на нямецкія грошы.

Сёння стаўленне да аб'ектаў гістарычнага мінулага амаль не змянілася. Бетонныя бліндажы, доты, акопы, па якіх можна было б вывучаць гісторыю фартыфікацыі, часта пераўтвараюцца ў звалкі для смецця. На палях, дзе яны перашкаджаюць сельскагаспадарчай дзейнасці, ад іх імкнуцца пазбавіцца. Дзіўна, што яшчэ нешта захавалася. Толькі з такім стаўленнем да гістарычнага мінулага і гэта можам страціць.

...Вядомы журналіст і фатограф не ставіць перад сабой глабальных мэт. Як ён сам лічыць, яго задача — толькі знайсці аб'екты Вялікай вайны. Сам працэс пошуку цікавіць Уладзіміра Багданава. Невыпадкова ўвесь вольны час ён прысвячае вандроўкам па Беларусі. А колькі яшчэ працуе напярэдадні падарожжа. І ўсё трымаецца на адным энтузіязме, за які, вядома, грошай не плацяць, ды і асаблівай пахвалы не дачакаешся. Толькі каб не было такіх апантаных людзей, як Уладзімір Багданаў ці Барыс Цітовіч, які на Вілейшчыне аднавіў шматлікія аб'екты таго часу, наўрад ці мы сёння, акрамя гісторыі за школьны курс, ведалі б нешта пра Першую сусветную вайну. Больш за тое, маглі б і не пабачыць той спадчыны, якая хутка адзначыць свой векавы юбілей.

Вераніка КАНЮТА

Могілкі Першай сусветнай вайны ў Каўпеніцы, што пад Баранавічамі. 1917 г.

Фотаздымкі Уладзіміра БАГДАНАВА.

Варвары ўжо «папрацавалі»... 2006 г.

ГРЫБЫ «ПАХАВАЛІСЯ», СВІНІНА КАШТУЕ АМАЛЬ ЯК КУРЫЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Побач з мяснымі знаходзяцца рады, дзе гандлююць курацінай. Цікава, што кошт за кілаграм курынага філе — ад 59 да 66 тысяч рублёў. Тут самы час яшчэ раз узгадаць вышэйпазначаную цану на свіную паляндвіцу — ад 68 тысяч. Дарэчы, яшчэ якіх месяца паўтара таму на рынку магчыма было набыць курынае філе па 55 тысяч за кілаграм, а ў адным з мінулых «Шпацыроў» (у канцы чэрвеня) было пазначана, што свіная паляндвіца на той момант каштавала 85 тысяч за кіло.

З крытага рынка іду да радоў, дзе звычайна можна знайсці лясныя грыбы.

На прылаўку ў аднаго прадаўца стаіць пяць літровых слоікаў і два невялікія вядзерцы з лісічкамі, на выгляд крыху сухаватымі. За літровы слоік давядзецца заплаціць дваццаць тысяч рублёў.

Крыху паводдаль лісічкі (дарэчы, ужо нашмат больш «сімпатычныя») прадаюцца на вагу. Кілаграм каштуе 50 тысяч рублёў. Іншых лясных грыбоў я на рынку так і не знайшла. Нібыта «пахаваліся» некуды. Затое ўдосталь было на прылаўках вешанак, якія каштавалі 33 тысячы за кілаграм.

Лясныя ягады не сыходзяць з прылаўкаў, хаця ў лесе многія з іх ужо, так бы мовіць, «у дэфіцыце». За кіло чарніц просяць ад 35 да 38 тысяч рублёў. Буякі, вырашчаныя на плантацыі, выглядаюць вельмі свежымі і апетытнымі. Праўда, кошт можа хутка адбіць у некаторых пакупнікоў любыя «апетыты»: 83 тысячы за кілаграм. А вось ажыны прапануюць усяго па 10 тысяч рублёў за паўлітра.

У вялікай колькасці на Камароўцы зараз прадаюць яблыкі гатунку «Белы наліў». Сітуацыя з імі, дарэчы, як колькі тыдняў таму з абрыкосамі: гаспадыні актыўна закупляюць іх на варэнне. Кошт — ад 13 да 20 тысяч за кілаграм. А вось абрыкосаў цяпер танней як па 20 тысяч за кіло не знойдзеш. Вельмі цікавы кошт на чарэшню. На адным за латкоў стаяла скрынка з гэтымі ягадамі, за кілаграм прасілі ўсяго толькі 15 тысяч рублёў. Мяркуючы па тым, што над скрынкай бесперашкодна кружылі восы, прадавец марыла такім чынам ад ягад хутчэй пазбавіцца. Крыху далей таксама гандлявалі чарэшняй, але на цэнніку стаяла ўжо лічба ў 120 тысяч рублёў за кілаграм.

ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ»
(цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае)

Персікі — 13 — 15 тысяч рублёў
Вінаград — 15 — 25 тысяч рублёў
Лімоны — 22 — 30 тысяч рублёў
Мандарыны — 22 тысячы рублёў
Апельсіны — 18 тысяч рублёў
Нектарыны — 18 — 23 тысячы рублёў
Слівы — 12 — 14 тысяч рублёў
Бананы — 10 — 12 тысяч рублёў
Кабачкі — 10 — 12 тысяч рублёў
Баклажаны — 10 тысяч рублёў
Зеляніна (кроп, пятрушка, цыбуля) — 3 — 5 тысяч рублёў (за 100 г)
Часнок — 3 — 8 тысяч рублёў (за штуку)
Радыска — 10 — 12 тысяч рублёў
Перцы — 8 — 40 тысяч рублёў
Капуста — 4,2 тысячы рублёў
Морква — 6,5 — 7 тысяч рублёў

На кавуны і дыні зараз — самы сезон. Першыя каштуюць на ўсім рынку аднолькава: прадаўцы просяць па 5 тысяч за кілаграм. Другія — ад 18 да 22 тысяч рублёў за кілаграм.

Сезон таксама і на бульбу. Невялічкія клубні можна купіць па 4,5 тысячы рублёў за кілаграм, а вось буйныя і гладкія «пацягнуць» на 7 тысяч рублёў. За кіло таматаў просяць у асноўным ад 7 да 10 тысяч рублёў, а гуркі каштуюць менш — 4 — 6 тысяч рублёў за кілаграм.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Дата

85 гадоў таму зборная Беларусі па футболе правяла свой першы афіцыйны матч

17 жніўня 1928 года каманда БССР у межах Усесаюзнай Спартакіяды сустрэлася са зборнай Швейцарыі.

Масква літаральна стракацела: Усесаюзная спартакіяда была маленькай Алімпіядай, якая сабрала больш за 7 тысяч удзельнікаў! У саюзную сталіцу прыехалі не толькі з усіх куткоў краіны Саветаў, былі яшчэ дэлегацыі спартыўных аб'яднанняў Фінляндыі, Англіі, Уругвая, Швейцарыі... На баксёрскім рынгу выдатна дзейнічаў фін Юр'ё Паакі, швед Гунар Берлунд, які ў 1934-м стане пераможцам кантынентальнага першынства. А вось у класічнай барацьбе (сярэдняя вага) роўных не было немцу Вернэру Зэленбіндэру. Жыццёвы лёс не пашкадуе гэтага моцнага і целам, і душой чалавека. Праз 16 гадоў ён будзе расстраляны гітлераўцамі ў турме Брандэнбурга...

Але беларусаў на Усесаюзнай спартакіядзе, зразумела, найбольш цікавіў футбол. У турніры ўдзельнічала 21 зборная, сярод якіх былі 4 аматарскія замежныя каманды. У адной групе выступалі каманды РСФСР, а ў другой — астатнія савецкія рэспублікі і замежнікі. Пераможцы груп і разыгрывалі паміж сабой званне чэмпіёна спартакіяды.

— Яшчэ напярэдадні спаборніцтваў у беларускім друку актыўна абмяркоўвалі тых, хто павінен прадстаўляць рэспубліку на гэтым турніры, — кажа **Аляксандр Томін, даследчык футбольнай гісторыі, суаўтар кнігі «Дынама Мінск.** Гульня на полі гісторыі». — У выніку ў каманду трапілі наступныя футбалісты: варатар Халмагораў (Полацк), абаронцы Ільін (Полацк), Палякоў (Гомель), паўабаронцы Лабкоўскі (Гомель), Гаўрылаў (Полацк), Лавейка (мінскае «Дынама»), нападаючыя Гваздкоў (Полацк), Марозаў (кавалерыйская дывізія, Мінск), Феакцістаў (Полацк), Ціхамірaў і Кочын прадстаўлялі мінскае «Дынама».

Цікава, што матч паміж беларусамі і швейцарцамі быў дэбютным не толькі для нашай каманды, але і для маскоўскага стадыёна «Дынама». Арэна была спраектавана архітэктарамі Аркадзем Лангманам і Лазарам Чарыковерам спецыяльна для спартакіяды. На той момант трыбуны маглі прыняць 25 тысяч балельшчыкаў. За матчам паміж беларусамі і швейцарцамі сачылі 7 тысяч гледачоў, што ў два разы перавышае колькасць балельшчыкаў на нядаўняй гульні Беларусь — Чарнагорыя. Беларусы здолелі перайграць саперніка з лікам 6:3 — праўда, пасля саступілі Украіне (2:6) і Фінляндыі (1:2).

Фота з архіва Аляксандра ТОМІНА.

Беларусы атакуюць вароты швейцарцаў.

— У сваёй групе каманда БССР заняла 4-ы радок, але ў заліку сярод футбольных дружын СССР яны сталі трэцімі пасля зборных Масквы і Украіны. У такім выпадку можна лічыць, што наша зборная стала бронзавым прызёрам. Гэта першы поспех нашай каманды, — дзеліцца падрабязнасцямі Аляксандр Томін.

Пастаноўка пытання ў назве артыкула можа выклікаць шэраг пытанняў у чытача. Маўляў, якая гэта была зборная, калі Беларусь не была незалежнай краінай? Ці ўдзельнічала яна ў буйных міжнародных стартах? Зразумела, што не. Аднак, менавіта ў далёкім 1928 годзе зборная нашай саюзнай рэспублікі, складзеная цалкам з жыхароў нашай краіны, удзельнічала ў першых значных спаборніцтвах і атрымала першую прыгожую перамогу.

Тарас ШЧЫРЫ

ДОБРЫ КАМБАЙНЕР — СЫТЫ КАМБАЙНЕР

У краіне налічваецца 1 381 гаспадарка, у якіх працуюць 44,1 тысячы механізатараў. Прадпрыемствы грамадскага харчавання спажывецкай кааперацыі абслугоўваюць 8,9 тысячы чалавек у 200 гаспадарках, паведамілі ў Белкаапсаюзе.

Пры арганізацыі харчавання механізатараў прадпрыемствы грамадскага харчавання выкарыстоўваюць мінімальную нацэнку на ўласную прадукцыю. Сярэдні кошт аднаразовага харчавання — абеду — па краіне складае 30 тысяч рублёў. Абед складаецца з першай і другой страў, напою, кандытарскіх вырабаў, хлеба. Выхады першых страў, гарніраў, напояў павялічаны ў параўнанні са звычайным рацыёнам удвая (першая страва — 500 грамаў, гарнір — 200-300 грамаў, па дзве трэціх стравы).

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Жывая зямля

ВЯРБЛЮДУ МЯНУШКУ ДАДУЦЬ НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

У Магілёўскім заасадзе з'явіўся новы жыхар — двухгорбы вярблюд. Ён паходзіць з Казахстана, а набыць яго ўдалося ў Маскве з дапамогай сталічнага прадпрымальніка.



Пакуль вярблюд безыменны. Вырашана, што мянушку яму дадуць на конкурснай аснове навучэнцы прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа (аграгарадок Буйнічы Магілёўскага раёна), для якіх заасад з'яўляецца навучальна-вытворчай пляцоўкай.

— Мы аб'явім конкурс 1 верасня і праз тыдзень вызначымся, — сказаў дырэктар каледжа Георгій Маліноўскі. — Гэта наш першы вярблюд, трэба яго назваць прыгожа. Дзеці ў нас вельмі творчыя, так што цікавых варыянтаў будзе шмат.

Вярблюду яшчэ толькі год. У будучыні яму плануюць набыць і сяброўку. У заасадзе гавораць, што вярблюду наш клімат добра падыходзіць: гэтая жывёліна можа вытрымліваць не толькі спякоту, але і моцны мароз.

Ілона ІВАНОВА.

НЕВЯДОМЫ ЗВЯРОК, ПАДОБНЫ НА ЯНОТА, ЗНОЙДЗЕНЫ Ў ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫЦЫ

Спецыялісты далі яму імя АЛІНГІТА. Гэта новы від млекакормячых, якога больш за 100 гадоў таму памылкова прымалі за падобнага на яго алінга. Даследнікі выявілі алінгіта ў горных лясах Калумбіі. Жывёла адносіцца да сямейства янотавых, мае памеры янота і пысу плюшавага мішкі. Даследнікі з Смітсанаўскага інстытута ў Вашынгтоне вывучылі зубы, чэрап і скуру дзіўнага звярка і пацвердзілі, што гэта — першы выяўлены ў Новым свеце за 35 гадоў новы від драпежных жывёл.

Сяргей КУРКАЧ

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 31 (201)

«МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ» ЎСТАНОЎЛЕНА!

Героі твораў Уладзіміра Акулава вызначаюцца са стагоддзем, у якім існуюць

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва працягвае знаёміць з прадстаўнікамі беларускага авангарду 1980—1990-х гадоў. Асоба жніўня — Уладзімір Акулаў: яго выстава знаходзіцца ў Вялікай зале музея. Але калі ідзеш міма музея, бачыш плакат, то пачынаеш думаць: нешта знаёмае… Але што?..

Уладзімір Акулаў у 1980 годзе скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Працаваў выкладчыкам выяўленчага мастацтва, дырэктарам Дома культуры, мастаком-афарміцелем. Удзельнік рэспубліканскіх, Усесаюзных і міжнародных выстаў. Творы знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, ЗША.

Па-першае, адказ знойдзе той, хто памятае час, калі ў беларускім мастацтве раптам аказалася шмат усяго такога, чаго дагэтуль не паказвалі на выставах: і не тое, і не так адлюстравана. Але мастацтва авангарду, якога нібыта і не існавала, насамрэч жыло ў сваім асяродку, па нейкіх сваіх правілах, усталёўвала свае крытэрыі ды меркі, што можа называцца добрым творам. Акулаў з таго часу. І застаецца пры сваіх крытэрыях. Гэта пачынаеш разумець, калі цябе сустракае першы ж твор, а потым прыглядаешся, учытваешся ў назвы, глядзіш дату… Усе творы на выставе 2012—2013 гадоў. Новыя. Але калі глядзіш іх, ёсць адчуванне, што той дзіўны час (прынамсі, нейкі яго дух) для яго працягваецца. Ці мастак застаецца верным таму авангарду, нягледзячы на тое, што новае стагоддзе прынесла ў жыццё нейкія свае тэмы, ідэі, думкі пра людзей і свет.

І тут, па-другое, думаеш аб тым, што якое б ні было стагоддзе — гэта найперш Беларусь. А яна, як ні дзіўна, можа быць па-за часам. Ці не, не так: яна жыве па сваім гадзінніку, дзе час — катэгорыя вельмі ўмоўная, хоць мяняюцца дні, даты, гады, ее людзі, яе свет. І нават рэчаіснасць — усё такая ж не падобная да арыгіналу, калі карыстацца меркамі вельмі жывога і дагэтуль распаўсюджанага ў нас рэалізму, — у Акулава да болю познавальная. Можа быць, таму, што ён адлюстроўвае беларускую рэчаіснасць знутры: сам мастак нарадзіўся ў Баранавічах, а цяпер жыве ў Слуцку. Таму пазнаеш, адкуль у яго гэты вобраз: «Дача на дачы, хата на хаце». Пазнаеш «Горад на ўзбочыне». Разумееш, для чаго створаны — «Царом і прасталюдзінам». І верыш у наш асаблівы «Вялікдзень», які дае магчымасць уваскрэсення… Уваскрэсення для ўсіх, і для герояў з дзіўнымі тварамі, якія родам з жудаснага, багатага на трагедыі XX стагоддзя, герояў, якія ўсё яшчэ не вераць, што жывуць у XXI, не могуць паверыць у тое, што яны ж самі вызначаюць, якім будзе яго аблічча. Можа, там у некаторых з іх збянтэжана-спалоханыя твары, ці, наадварот, — упарта-ўпэўненыя, што ў жыцці ўсё так, як трэба. Але глядзіш — і верыш у сапраўднасць гэтых герояў. Верыш у сапраўднасць — таму што глядзіш збоку на… той свет, дзе ёсць і ты сам. Пры тым, што не хочаш верыць, што такім ён павінен быць у гэтым часе. І сапраўды, шукаеш для герояў магчымасць існаваць далей.

Аўтар, напэўна, таксама шукае. Паглядзеўшы на яго людзей і на іх асяродак, спачатку думаеш: вось толькі ў такой манеры і разважаць пра іх, у такіх фарбах. Але нават сярод змрочных адценняў прарываецца колер і нараджаюцца думкі. Узгадваюцца словы. Напрыклад, аўтар звяртаецца ў адным творы да Феафана Затворніка: «Цяпер вы бліжэй да ўратаваных, чым тады, калі паверылі»… Сур'ёзныя словы спачатку здаюцца нібыта з іншага свету — не нашага. З таго, дзе гэты асобны свет стасуецца з Сусветам, з ісцінай і справядлівасцю, з вечнай праўдай і нязгасным святлом. З тым, што можна лічыць паралельнай рэчаіснасцю, якая існуе побач з нашай. І дзе ж тады яе знайсці, каб выразней загучалі гэтыя ісціны? Адказ таксама ёсць: гэтая паралельная рэчаіснасць насамрэч унутры нашай, таму яе так цяжка намацаць, голас, які ідзе знутры, прасцей заглушыць, а вечнае святло абвясціць міфам. Усё можна зрабіць з чалавекам, з яго свядомасцю. Усё, пакуль ад болю і пакут не прарвецца ў ім гэтая паралельная рэальнасць, нагадваючы, што ён носіць у сабе сусвет, і таму няма чаго баяцца. Няма чаго баяцца сябе. Няма чаго баяцца іншых. Няма чаго думаць, што яны моцныя. Няма чаго баяцца быць моцным. Міналі стагоддзі ў чалавечай гісторыі, кожнае знаходзіла магчымасць давесці гэта людзям.

Некаторыя зразумелі. І даказваюць сваю творчую тэарэму: магчыма быць сабой, магчыма быць верным ідэалам аднойчы абранага мастацтва. Як Уладзімір Акулаў, які, не здраджваючы сабе, застаецца авангардыстам не толькі ў сваёй манеры бачыць і адлюстроўваць свет, ён яшчэ захоўвае той дух творчасці, якая выбухнула 30 гадоў таму і вяла дыялог з чалавекам, правакуючы яго на тое, каб выцягнуць з сябе паралельную рэчаіснасць, напоўненую жыццём, святлом, думкамі.

Гэта трэцяе, што падалося знаёмым з 80-х гадоў мінулага стагоддзя, калі мастацтва стварала глебу для дыскусій пра тое, як і дзе мы жывём, а таксама дзеля чаго. І хоць кажуць, што час для мастацтва цяпер іншы і кожны творца вядзе развагі перш за ўсё сам з сабою, але ёсць такое адчуванне, што гэтая выстава стварылася не толькі, каб прадставіць творцу Уладзіміра Акулава і яго новыя жывапісныя працы з калекцыі Андрэя Плясанава і яго асабістай. Такое адчуванне, што праз гэтую выставу з намі хацелі пагаварыць.

Дзяўчынка-падлетак «завісла» каля карціны: «Прышпільна… Гэта што, людзі такія?.. А што?!. Людзі такія…»

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Асобы

АНДРЭЙ МРЫЙ: вяртанне з ссылкі

У сакавіку 1934 года мой бацька быў прагавораны да пяці гадоў зняволення ў Карагандзінскі канцлагер. На той момант у сям'і было трое дзяцей: мяне яшчэ не было. Пры апошнім спатканні з жонкай бацька перадаў ёй сваю заяву ў пракуратуру на імя Старшыні Вярхоўнага Суда СССР. Правёўшы мужа ў лагер, мама адвезла малодшых дзяцей часова да сваіх састарэлых бацькоў у г. Прапойск (цяпер Светлагорск) Магілёўскай вобласці, а са старэйшым сынам Юрыем (5 гадоў) паехала ў Маскву і асабіста перадала заяву намесніку Старшыні.

Справа была перагледжана, і праз 9 месяцаў, у лістападзе 1934 года, бацька быў вызвалены з канцлагера. Яго адправілі на вольнае пасяленне ў горад Вельск (Валагодскай вобласці) на два гады. Там ён працаваў бухгалтарам леспрамгаса Масгарпаліва, старанна і акуратна выконваючы свае абавязкі — яго лічылі добрым работнікам. У той жа час ён заставаўся пісьменнікам з 10-гадовым літаратурным стажам (яго першае апавяданне, «Пятрок», выйшла ў 1924 годзе); Андрэй Мрый не мог расстацца з думкай аб літаратуры. Пазней у пісьме «Сябру працоўных» (1941) ён прызнаваўся, што за час з 1934 года ім была напісана вялікая колькасць твораў. А. Мрыю было за сорак, за спінай — немалы жыццёвы вопыт. Ледзь не трэць яго склалі страшэнныя пакуты, перажытыя падчас дзвюх войнаў (1916—1921) і ў Карагандзінскім канцлагеры. Гэта была горкая трэць, якая не магла не патрабаваць выхаду, не выклікаць прагу творчасці — «літаратурны сверб», як ён сам гумарыстычна вызначаў сваё імкненне пісаць.

Адвёзшы заяву ў Маскву, мама пакінула сына Юру ў старэйшай сястры бацькі Антаніны Антонаўны Стратановіч і паехала ў Ленінград. Пасля арышту мужа яна засталася без сродкаў да існавання і шукала працу, таму што спецыяльнасць педагога, атрыманая ёю ў 1924 годзе ў Ленінградскім псіханеўралагічным інстытуце (цяпер імя У. М. Бехцерава), у 1920—1930-я гады ставілася пад сумненне, а ў 1936 г. была афіцыйна забаронена Пастановай ЦК ВКП (б). У Ленінградзе сябры па інстытуце дапамаглі маме атрымаць працу ў Сестрарэцку Ленінградскай вобл. і праз год яна ўзяла да сябе Юру. У Сестрарэцку яна працавала з 1934-га па 1938 год спачатку выхавальніцай дзіцячага санаторыя, пасля настаўніцай у школе. Ёй давялося памяняць кваліфікацыю і скончыць вячэрні настаўніцкі інстытут пры ЛДІ імя А. І. Герцэна (1936—1939).

У памяці малодшых дзяцей захаваліся карціны Прапойска. Артур памятае, як у дзядулі і бабулі яго каталі разам з Аксанай у дзіцячай калясачцы. Аксана — як яе кармілі яечкам і кісялём. Каб забраць хлопчыка, прыехаў брат маці І. А. Зыкаў, па дзяўчынку — малодшая сястра бацькі К. А. Шашалевіч. Пагодкі назаўсёды засталіся ў прыёмных бацькоў.

Тэрмін высылкі ў Вельск канчаўся ў пачатку 1937 года, 27 студзеня бацька атрымаў савецкі пашпарт, яму прапанавалі аднавіцца ў правах камандзіра запасу. Але перспектыў працаўладкавацца не было — нават маючы самыя добрыя водгукі ад прафсаюзных і партыйных органаў. Некаторы час удавалася заставацца на былым месцы ў леспрамгасе, летам бацька з'ездзіў пабачыцца з сям'ёй у Ленінград і ў Петразаводск, а з канца 1937 года пачаліся пошукі працы, ліхтугі.

Звесткі ад родных неслі ў сабе цяжкія перажыванні. Увосень 1937 года на 10 гадоў лагераў быў асуджаны брат бацькі, беларускі паэт і драматург Васіль Антонавіч Шашалевіч. Тады ж быў асуджаны «без права перапіскі» і Н. В. Хрысанфаў — муж Ксеніі Антонаўны, які даў прытулак Аксане і цёпла прыняў бацьку летам 1937 года ў сябе ў Петразаводску. Пакінуўшы Аксану ў сваякоў мужа, Ксенія Антонаўна, біёлаг па прафесіі, знайшла працу настаўніцай нямецкай мовы за 60 км ад горада. Але дабірацца туды (Поўнач ёсць Поўнач!) жанчыне з пяцігадовым дзіцем давялося цэлы дзень зімой па лёдзе Анежскага возера на кані. Часам беглі за санямі, каб сагрэцца: свяціла сонца, але ўсё роўна запомніўся пранізлівы холад.

Калі бацьку без усякай матывіроўкі знялі з працы ў Вельскім леспрамгасе, ён прыехаў да мамы і Юры ў Сестрарэцк у студзені 1938 года, але, не атрымаўшы прапіску і працу, праз два тыдні з'ехаў. Два месяцы пошукаў самай простай працы, гатоўнасць ехаць у непрыступныя, неабжытыя месцы былі ўзнагароджаны: на Мурманскім узбярэжжы ў пасёлку Церыберка яму далі працу бухгалтара рыбнага каператыва. Гэта адбылося ў сакавіку або красавіку 1938 года. На прафулік ён стаў 1 лістапада. Увосень мама з Юрам пераехалі ў Мурманскую вобласць, яна атрымала працу настаўніцы ў Кольскай сярэдняй школе. Бацька таксама стаў працаваць у гэтай школе спачатку бухгалтарам, пасля настаўнікам рускай мовы і літаратуры: 25 мая 1939 года яго прынялі на мясцовы прафулік.

Усё як быццам наладжвалася. Мама ўсё жыццё захоўвала моцна пабляднелы аматарскі здымак Кольскага перыяду; нейкім цудам ён ацалеў і ў час пажару, ад якога згарэла ўся наша вёска Паўлічы ў акупаванай Бранскай вобласці. На фатаграфіі бацька зняты аголеным па пояс на фоне саамскага чума. Здымак мог быць зроблены летам 1938-га, 1939-га або 1940 года… Бацька любіў гатаваць сам, асабліва яечню, старанна прасмажваючы яе, абавязкова пераварочваючы ніжнім бокам уверх. З той пары, як перахварэў на тыф на Дзянікінскім фронце пад Новахапёрскам, ён быў вельмі асцярожны ва ўжыванні ежы. Акопнае жыццё нагадвала пра сябе рэўматычнымі болямі, якія не давалі заснуць па начах. Але пачуццё нормы жыцця перамагала.

Перад Новым 1940 годам, узгадвае Аксана, у Сенную Губу, дзе яна жыла цяпер з Ксеніяй Антонаўнай (Аксана звала яе мамай, а нашу маму — цёткай Соняй), прыйшла пасылка з Колы: «Цётка Соня і Андрэй (мой бацька) паведамілі, што ў іх нарадзілася дзяўчынка, якую збіраюцца назваць рускім імем — Наталля або Таццяна. Я была чамусьці за Таццяну, але ў наступным пісьме было напісана, што назвалі Наташай. (…). У пасылцы былі старыя тоўстыя валёнкі, поўныя шакаладак, і дэмісезоннае паліто «на выраст» для мяне. Валёнкі, вельмі цёплыя, я насіла некалькі гадоў, аж да 6 класа або далей».

Старэйшым дзецям імёны даваў бацька. Артура ён назваў па імені героя рамана Э. Л. Войніч «Авадзень», жадаючы сыну мужнасці і трываласці. У імені дачкі адлюстравалася яго захапленне вобразам красуні Аксаны, якая смяецца, з апавядання М. В. Гогаля. Але на гэты раз рэгістраваць дзіця пайшла мама, і яна задумала: дваіх старэйшых давялося аддаць, няхай жа малодшая застанецца свая, родная… Natalis на латыні азначае «родная». Бацька ж называў мяне (не без суму, мабыць) Наташкай-Запаляркай, па аналогіі з іменем гераіні оперы М. Лысенкі «Наталка-Палтаўка».

Згодна са старонкай аб аплаце членскіх узносаў у бацькоўскім прафсаюзным білеце, у лютым — сакавіку 1940 года ён браў бальнічны ліст і, як відаць, няньчыўся са мной, таму як у мамы паслярадавы дэкрэтны водпуск — два месяцы — прыпадаў на снежань-студзень. Двух-трохмесячныя немаўляты большую частку сутак спяць; я, спавітая, ляжала перад бацькам на стале, а ён пісаў, пісаў… Пра што? — пыталася я гадоў праз 12—13 у Негаўцы (Буда-Кашалёўскі раён Гомельскай вобласці), калі мама асмелілася, нарэшце, расказаць мне пра яго крыху больш, чым раней. Пра тое, што перажыў у лагеры і на франтах, адказвала яна, — цяжкі, горкі вопыт: голад, цынга, тыф, усялякія анамаліі… Многае ў яго творчасці ішло ад М. В. Гогаля і Ф. М. Дастаеўскага — напрыклад, жанравая форма «запісак», у якую ён увасобіў свой першы раман. Здаецца, і другі раман, «Жывы дом», быў пабудаваны ў форме «запісак», але галоўнае ў ім — палеміка з Ф. М. Дастаеўскім. Лагер не «мёртвы дом», жывы — такая ідэя.

З мая 1940 года бацька выходзіў на працу. Мама казала, што ў мяне была нянька — мабыць, яе прынялі ў гэты час. Нам заставаліся тры месяцы свабоднага, мірнага жыцця…

Дзеці раслі і пазнавалі свет. Кожнае лета Ксенія Антонаўна з маленькай Аксанай адпраўляліся ў падарожжа. У 1940 годзе яны ажыццявілі нават два. Перасяліліся з Сеннай Губы назад у Петразаводск, і Ксенія Антонаўна стала працаваць настаўніцай нямецкай мовы. А ў канцы лета яна пабывала ў Коле. Мэту паездкі Ксенія Антонаўна не раскрывала дзіцяці, толькі штосьці расказала пра карлікавыя палярныя бярозкі, пра палярныя ночы; у тыя гады праславіліся папанінцы і чалюскінцы. Запаляр'е ўвайшло ў моду. Да расчаравання дзяўчынкі, Кола аказалася звычайным пасёлкам з глыбокай рэчкай, з вялікімі, а не карлікавымі дрэвамі. Пасля прыезду ў размове дарослых прысутнічаў Андрэй, але самога яго не было. На дзень-два мама і Ксенія Антонаўна адлучыліся ў Мурманск. Юра і Аксана заставаліся адны, мяне з імі не было — дарослыя або ўзялі з сабой, або пакінулі ў нянькі. Дзеці чыталі кніжку А. Някрасава «Прыгоды капітана Врунгеля». Назаўсёды запомніўся Аксане эпізод каля карабля «Победа», капітанам якога быў Врунгель. «По» сцерлася, і жыхары нейкай краіны, убачыўшы карабель, закрычалі: «Няхай жыве «Беда»!». Дзеці ад душы рагаталі, не ведаючы нічога пра тую страшэнную бяду, якая зноў адбылася ў нашай сям'і ў пачатку чэрвеня: бацька зноў быў арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў лагераў.

Сярод маіх успамінаў ёсць адзін самы ранні, мне цяжка аднесці яго да нейкага пэўнага месца і часу. Памятаю сябе ў дзіцячым ложку, вакол паўзмрок, цішыня, нікога няма, пуста… Ці крычу, ці плачу, маўчу? — у памяці не засталося; толькі працяглае адчуванне пустэчы, насцярожанасці. Ці здарылася гэта ў Коле ў дні гора і арышту? Бываць там у свядомым узросце мне не даводзілася.

Апошні этапны шлях (згодна з дакументамі) зняволенага А. А. Шашалевіча — лагерны нумар 1142. Згодна з Заявай нашай маці аб рэабілітацыі (1957), у ліпені-жніўні 1940 года ён трапіў у лагер Вічка Мядзведжагорскага р-на, эвакуяваны з лагерам у Архангельскую вобласць, пасля ў Чыгуначны раён Комі. Паводле даведкі УУС Комі, апошнім месцам зняволення быў Усць-Вымлаг, сюды бацька прыбыў 12.10.1942 г. з Беразлага і быццам бы «вызвалены» 25.09.1943. Складзём падагульняючую схему шляху: Вічка Мядзведжагорскага раёна, 1940—1941 гг.— Беразлаг (Архангельскай вобласці?), 1941—1942 гг.— Усць-Вымлаг (Чыгуначнага раёна?) Комі, 1942—1943 гг.

Падчас другога арышту была затрымана вялікая колькасць бацькоўскіх навел, аповесцяў і раман з лагернага жыцця «Жывы дом». Што стала з рукапісамі? Калі яны не былі знішчаны адразу пасля вынясення прысуду, то з пачаткам вайны наўрад ці ацалелі, хоць бываюць цуды. Пошук рукапісаў па маім запыце ў архівах Мурманскага, Мінскага і Комі МУС не даў ніякіх вынікаў…

У кастрычніку 1940 года мы з мамай і Юрай былі высланы з Мурманскай вобласці як сваякі «ворага народа», маючы 24 гадзіны на зборы. Спынілі ся на дзень у Петразаводску. Юра быў моцна расстроены, і я таксама. Адсюль мы паехалі ў Бранскую вобласць, таму што ўезд у Беларусь нам, відаць, быў забаронены. У суседняй Магілёўскай вобласці жыла сям'я брата маці, якая ўсынавіла Артура. У сяле Паўлічы мама знайшла працу настаўніцы. Але пачалася вайна, мы не змаглі эвакуявацца і трапілі ў акупацыю ў вельмі бядотным становішчы.

Між тым, у Петразаводску восень і зіма 1940 года прайшлі ў школьных клопатах (Аксана пайшла ў першы клас), а вясной 1941 года Ксенія Антонаўна з'ездзіла ў Мядзведжую Гару на спатканне з братам. Вярнуўшыся, яна ўсхвалявана чытала блізкім пісьмо бацькі да Сталіна. Аксане, якая пры гэтым прысутнічала, запомніліся яе словы: «Андрэй трымаецца бадзёра, але ў яго выбіты ўсе зубы (быццам бервяном). Ён сказаў, што катуюць там, што не даюць спаць і ўвесь час, круглыя суткі, свецяць у вочы…». Гэтыя катаванні ён вытрымаў, мяркуючы па пратаколах допытаў, якія праз шмат гадоў мы разам з Аксанай чыталі ў яго следчай справе. На пытанне следчага пра знаёмых, саслужыўцаў, сяброў ён адказваў: «У Мурманскай вобласці нікога не маю».

Вайна, якая пачалася, цяжкасці эвакуацыі перашкодзілі Ксеніі Антонаўне даставіць адрасату пісьмо «Сябру працоўных». Але колькі магла, яна падтрымлівала абодвух братоў Шашалевічаў, якія трапілі ў лагеры, перапіскай і пасылкамі. Ад Васіля Антонавіча перасталі прыходзіць пісьмы ў 1942 годзе… Пра трагічную гібель нашага дзядзькі расказаў праз шмат гадоў яго сябар — беларускі паэт і пісьменнік С. І. Грахоўскі, які без віны адседзеў 10 гадоў у лагерах у час сталінскіх рэпрэсій. Праз этапнікаў ён даведаўся: невядома хто раптоўна падпілаваў бярозу на лесапавале і спусціў яе на Васіля Антонавіча, які быў камісаваны і працаваў падлікоўцам…

Перапіска ж з бацькам працягвалася да кастрычніка 1943 года. Ён пісаў, што здароўе яго слабае, яму далі 1 групу інваліднасці і збіраюцца вызваліць. Вырашылі, што прыедзе ў Кінешму Іванаўскай вобласці, дзе знаходзіліся Ксенія Антонаўна і Аксана. У кастрычніку пісьмо, накіраванае Ксеніяй Антонаўнай у лагер, вярнулася з пометкай: «Выбыў на вызваленне ў Кінешму».

Вестка аб гэтым пасля вызвалення Бранскай вобласці прыйшла да нас ад Ксеніі Антонаўны зімой 1943—1944 года. Як і ўся вёска, пасля пажару мы жылі ў зямлянцы: пісьмо мама чытала пры святле ўваткнутай у сцяну лучыны. Юра горка плакаў, але тады да многіх прыходзілі «пахавальныя». Мы вырашылі, што бацька жывы і толькі прапаў без вестак. Адчайны падлетак уцякаў шукаць яго ў Магадане — на таварняках, «зайцам»…

…Лагернае начальства нам схлусіла. Не ў Кінешму быў адпраўлены наш бацька пасля «вызвалення». У 2000 годзе мы з сястрой, прачытаўшы следчую справу бацькі, запыталі УУС Комі аб месцы смерці і пахавання пасмертна рэабілітаванага ў 1956 годзе А. А. Шашалевіча. Вочы мае доўга адмаўляліся прыняць змест адказу. Нарэшце, асмельваюся прывесці яго: «Паведамляем, што Ваш бацька Шашалевіч Андрэй Антонавіч, 1893 г. н., сапраўды адбываў пакаранне ў Усць-Вымлагу Комі з 12.10.42 … прыбыў з Беразлага. Ён быў вызвалены 25.09.43 г. і накіроўваўся да месца жыхарства — Фрунзенская вобласць, Каганавіцкі раён, ст. Наватроіцкі. Па шляху руху 8 кастрычніка 1943 г. у цягніку быў знойдзены труп Шашалевіча Андрэя Антонавіча, аб чым складзены акт — начальнік эшалона, медсястра, упаўнаважаны міліцыі. Месца пахавання невядома. Паведамленне аб смерці накіроўвалася ў ГАМ УУС Мурманскай вобл. 24.05.57 г. за № 1/1032. Падстава, арх. л/с.».

Ізноў невядома хто выканаў злую волю…

Падчас азнаямлення са следчай справай нам аддалі разам з прафсаюзным білетам лагерную фатаграфію бацькі. На адвароце ніякіх запісаў або паметак: на ражку негатыва — нейкія лічбы і знакі. Стомлены, няголены твар, шынель… Не аматарскі здымак, але і не стандартны «зэкаўскі» — стандартных у справе два: анфас, профіль. Здымак зроблены, хутчэй за ўсё, незадоўга да «вызвалення», без ведама таго, каго здымалі: позірк яго накіраваны не ў аб'ектыў, а кудысьці ўбок, мабыць, да выхаду. У вачах — змяшаныя пачуцці, і дамінуе надзея. На жыццё, вяртанне, сустрэчу…

Наталля ПРУШЫНСКАЯ, дачка Андрэя Мрыя

■ Выставы

РУХАЦЦА ЗА ШАГАЛАМ

Сучасныя мастакі Ізраіля адлюстроўваюць вобразы любімых мясцін

Шагалаўскія мясціны — гэта ўжо ўстойлівы выраз. І ў кожнай краіне, дзе жыў мастак, ёсць куточкі, якія яго натхнялі. Усе мы ведаем, што ў нас у Беларусі — гэта яго радзіма, Віцебск. Але ён жа яшчэ жыў і стварaў у Францыі, у ЗША. Ён наведваў Ізраіль восем разоў, што таксама дало яму натхненне і асаблівым чынам было адлюстравана ў яго творчасці.

«Па слядах Шагала ў Ізраілі» пайшлі сучасныя творцы Аб'яднання прафесійных мастакоў Ізраіля, якія прысвяцілі праект з такой назвай 125-годдзю Марка Шагала, якое адзначалася летась. Перасоўная выстава прыехала ў Беларусь дзякуючы Ізраільскаму культурнаму цэнтру пры Пасольстве Ізраіля ў Беларусі. У мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага размяціліся 30 работ сучасных мастакоў Ізраіля, сярод якіх, дарэчы, ёсць тыя, хто нарадзіўся і пачынаў як творца ў Беларусі: Любоў Мінковіч, Андрыян Жудро, Барыс Караванаў, Ілья Хініч, Герман Няпомняшчы. І хоць прайшоў час, які мае ўласцівасць пакідаць адбітак на мясцінах, але ёсць асоба, імя якой існуе па-за часам. Як існуе па-за часам і тое, што створана вялікім мастаком. І гэта таксама можа натхняць нашых сучаснікаў. Тым больш што Шагал стварыў у Ізраілі вітражы для сінагогі ў Іерусаліме, мазаікі і габелены для будынка Кнесета; ён адлюстраваў сваё адчуванне гэтай зямлі ў мастацкіх творах і асэнсоўваў біблейскую гісторыю праз вобразы. Сёння ісці за Шагалам — гэта яшчэ і ўмець здзіўляць сваёй працавітасцю і творчай энергіяй. Нягледзячы на тое, што выстава доўжыцца толькі дзесяць дзён, ёсць яшчэ магчымасць у гэтыя выхадныя яе наведаць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ІМ НАТХНЯЎСЯ СКАРЫНА

Да канца верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстава «Марцін Лютэр: 530 гадоў з дня нараджэння», прысвечаная жыццю і дзейнасці нямецкага хрысціянскага багаслова і «вялікага рэфарматара». Выстава падрыхтавана сумесна з грамадскім аб'яднаннем нямецкай культуры «Масты», старшынёй якой з'яўляецца пастар лютэранскай царквы Вольга Штокман.

Экспазіцыю складаюць інфармацыйныя матэрыялы ды мастацкія творы, прысвечаныя Марціну Лютэру. І менавіта па іх цікава прасачыць шлях творчай і духоўнай эвалюцыі хрысціянскага багаслова. Ад нараджэння да заканчэння Эрфурцкага ўніверсітэта ў 1505 годзе, ад публікацыі славутых 95 тэзісаў супраць індульгенцый у 1517 годзе да перакладу тэксту Бібліі на нямецкую мову.

Беларусам гэтая выстава павінна быць цікавай асаблівым чынам. Усё-такі менавіта творчасцю і дзейнасцю Марціна Лютэра натхняўся наш выдатны суайчыннік, асветнік і першадрукар Францыск Скарына. Тады, калі ў Вітэнбергу Марцін Лютэр абвясціў 95 тэзісаў супраць індульгенцый, доктар лекарскіх навук Францыск Скарына пачаў у Празе друкаваць кнігі Старога Запавету ў перакладзе на беларускую мову. І наогул, праваслаўныя багаслоўвы сцвярджаюць пра істотны ўплыў ідэй Лютэра на дзейнасць Францыска Скарыны.

Дарэчы, у 2017 годзе споўніцца 500 гадоў з часу выдання Лютэрам сваіх 95 тэзісаў супраць індульгенцый да брамы Замкавай царквы ў горадзе Вінтэнберг. А таму з 2008-га да 2017 г. у Германіі ладзяцца Лютэраўскія дэкады, выставы, спектаклі, дыскусіі ды іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею Рэфармацыі і асобе аднаго з яе галоўных дзеячаў. А Беларусь, такім чынам, таксама ўключана ў ланцужок міжнародных акцый.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

■ Адкрыццё сезона

ТЭАТРЫ ПАЧЫНАЮЦЬ ПАТРЫЯТЫЧНА

Жнівень — гэта хіба не самы пакутлівы месяц для тэатралаў: месяц чакання адкрыцця новага тэатральнага сезона. Кожны беларускі тэатр рыхтуецца да гэтага свята па-свойму. Але адметна, што апошнім часам спектаклем адкрыцця становяцца пастаноўкі беларускіх аўтараў. І нават там, дзе звычайна аддавалі перавагу праверанай часам высокай класіцы...

Што прыемна, нават у Нацыянальным акадэмічным Рускім драматычным тэатры імя Горкага ёсць такая пастаноўка. Мала таго, тэатр фактычна апярэдзіў іншых, адкрыўшы сезон спектаклем «Пане Каханку» (аўтар А. Курэйчык, рэжысёр С. Кавальчык) у сярэдзіне жніўня. Публіка настолькі зачакалася тэатральных вечароў, што ўсе квіткі былі прададзены, у зале быў аншлаг, напрыканцы — гарачыя авацыі: беларуская тэма ў тэатры Горкага ўспрымаецца з удзячнасцю. Усё-такі гэта нацыянальны тэатр.

І не толькі гэты тэатр ідзе такім шляхам. Нават Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі другі сезон запар імкнецца пачаць беларускім творам. Калі летась ім стала опера «Сівая легенда» (Д. Смольскага, У. Караткевіча, пастаноўка М. Панджавідзэ), то сёлета 5 і 6 верасня мы чакаем прэм'еру балета «Вітаўт» (паводле музыкі В. Кузняцова).

І беларуская класіка на адкрыцці сезона, вядома, будзе. У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Янкі Купалы, згодна з традыцыяй, першай (10 верасня) з гледачамі сустрэнецца «Паўлінка», толькі ўжо абноўленая. Але пастаноўка паводле Янкі Купалы на пачатку сезона (5 верасня) будзе паказана ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі: «Адвечная песня» (пастаноўка С. Кавальчыка). Але ж сучасная драматургія побач: «Тры Жызэлі» (А. Курэйчык, пастаноўка А. Гарцуева) — 6 верасня.

Асабліва засумаваўшым па тэатры гледачам варта паклапаціцца пра квіткі загадзя: нас такіх вельмі шмат!..

Ларыса ЦІМОШЫК.

АДЗІНОТА З ВІШНЕЎСКІМ

Бліжэйшыя дні знакаміты польскі пісьменнік правядзе ў Мінску

Напярэдадні свайго дня народзінаў папулярны польскі пісьменнік Януш Вішнеўскі, аўтар сусветнага бестселера «Адзінота ў сеціве», прыехаў у сталіцу Беларусі, каб прэзентаваць сваю новую кнігу — «На Фэйсбуку з сынам».

Прэзентацыя адбудзецца сёння, 17 жніўня, у музеі гісторыі горада Мінска. Дарэчы, мерапрыемства пройдзе ў рамках праекта «OZART», на якім мастачка Ніка Сандрас і дызайнер Анастасія Півень прадставяць свае творы.

Таксама сёння з 11.00 да 12.30 адбудзецца адкрытая аўтограф-сесія пісьменніка на вуліцы Русіянава, 4 у краме OZ.by, якая і з'яўляецца арганізатарам візіту Вішнеўскага ў Мінск.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

■ Нататнік Яго жонкі

ЦУКАРНІЦА

Нядаўна зноў расхвастала цукарніцу. Ды ў Яго прысутнасці! Ды яшчэ такую зручную, якіх ніколі за ўсю гісторыю нашай сям'і не было: і рыльца шырокае, і бачкі надта ж пакатыя, і ўзяць ёсць за што... Было.

Суму па той цукарніцы — ані: ні ў вачах, ні на твары. Толькі ўсмешка — і там, і там. І ніколькі, дарэчы, не вінаватая. Зусім наадварот: хітрая такая ўсмешка. Як быццам нават задаволеная. Мяне, дальбог, зразумець немагчыма. Гэта я пра сябе, дарэчы, ведаю.

— Цяпер прыйдзецца купляць новую.

— Умгу, — ківаю, выраз твару не мяняючы.

— На гэты раз бяры якую металічную, — раіць Ён з адценнем мілай іроніі ў голасе, і мая ўсмешка саступае месца недаўменню, па большасці, вядома ж, ненатуральнаму.

— Чаму? — пытаюся я як мага больш наіўна.

— Ну як чаму? Каб больш не білася.

— А каму яна такая патрэбна?

Ненатуральнае недаўменне пачынае паціху перарастаць у сапраўднае, непадробнае: ну якія, каб хто адказаў, стасункі могуць быць у мяне — з металічнай цукарніцай? Гэта ж ні разбіць яе, ні новую купіць. Іншая справа — парцэлянавая!

Выпраўляешся па яе як на свята. Уяўляеш сабе па дарозе якую-небудзь цалкам адпаведную настрою: калі ў гарохі трапіцца — дык няхай тады будуць чырвоныя, выпуклыя, і сама — пузатая, круглая, з накрыўкай-шапкай. Ай не, лепш — худзенькая, вытанчаная, з хвалістым «каўнерыкам», аздобленым палоскай серабра ці золата, бела-белая і без ручак. Ці мо ў кветачкі? Тады каб былі абавязкова падглазурныя, сабраныя ў пяшчотны букецік, перавязаны ледзьве прыкметным блакітным пасачкам. Бачкі «гафрэ» і ручка вензелем, са стразамі? А што, у гэтым нешта ёсць...

Думаеш сабе так, уяўляеш, малюеш у галаве, а потым — бац! Трапляецца на вочы нешта «гэтакае». Такое, што і ў марах не ўяўлялася. І купляеш яе, сваю новую цукарніцу, і нясеш яе дадому ў адной кампаніі з новым ільняным абрусам, новымі папяровымі сурвэткамі ў тон, новым сіліконавым пэндзлікам для цеста, новым пачкам сапраўднага, на Цэйлоне запакаванага чаю і... ну, няхай сабе свечкай — на той выпадак, калі раптам патушаць святло, бо такое калі-нікалі бывае. І робіш дзеля яе, цукарніцы, яшчэ і генеральнае прыбіранне ўсяе кухні. І на яе заканчэнне пячэш ці пірог з шакаладам ці кракаўскае пячэнне з аўсянымі шматкамі і агрэставым джэмам. Маё любімае.

І Ён прапануе мне ад гэтага ўсяго адмовіцца?! Дзівак, навошта?

— Дзеля эканоміі, — адсякае Ён, ды так, быццам шматочак кракаўскага аздабляе скрылікам кіслючага лайма.

— Дзе ж ты тут убачыў эканомію? — падхопліваюся я, не ў стане ні на хвіліначку стрываць нагэтулькі прымусовае спалучэнне дагэтуль ніяк не спалучальнага.

Ну, далей, вядома, ідзе крытычна-аптымістычна-дыпламатычны дыялог. Самыя моцныя месцы ў ім, вядома ж, тыя, што прысвячаюцца... пытанням эканомікі краіны. Якая, безумоўна, павінна быць тым мацнейшай, чым больш значным будзе яе таварааабарот. Вось так. Ну, і як тут можна не прызнаць маю рацыю? Я, далібог, не разумею.

— Да таго ж ты прапануеш эканоміць на эмоцыях... — прамаўляю ўжо задумліва.

І думкі нясуцца далей, за межы сям'і і кухні. І з водарам чаю з Цэйлона сягаюць далёка-далёка.

Ажно да працоўнага кабінета.

Чаму, ну чаму — хто мне скажа? — у новых аповесцях калі і ядуць нешта, то невядома што і з чаго? Калі герой, перш чым выйсці ў «туманную прахалоду жнівеньскай раніцы», выпівае кавы, то чамусьці жнівеньская раніца са сваёй ніяк не апраўданай прахалодай апісана будзе аўтарам у такіх падрабязнасцях, прадзіраючыся скрозь якія забудзешся, навошта ён, герой, увогуле выходзіў. А якую каву піў? З чым, з якога посуду? Загадка. Ды хіба гэта не важна? З вялізнага вышчарбленага кубка, тонкай стромкай шклянкі і сыракенькай фаянсавай філіжанкі п'юць абсалютна розныя істоты! І яшчэ. Ніхто з сучасных пісьменнікаў не бярэцца апісаць абед ці вячэру так, як апісвалі яе «бацькі» пана Дубатоўка і пана падлоўчага. Мне падалося, што гэта пра нешта ды сведчыць. Пра што вось толькі? Пакуль не ведаю.

Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

■

■ Цяжкая артылерыя

«ВОСЬ ІДЗЕ ТАКАЯ ПРЫГАЖУНЯ, І ТЫ РАЗУМЕЕШ: КАРАЛЕВА!»

Неяк знаёмая пажартавала, што калі расшпіліць адзін верхні гузік у кашулі, то можна не фарбаваць вочы, калі адразу тры — наогул не спатрэбіцца касметыка. Узгадала, як іншы знаёмы заўважыў, што «лета — гэта добра, але, калі жанчыны скідваюць верхняе адзенне, даводзіцца цяжка».

— Вось ты не разумееш, — папракаў мяне Віталь, — як нам, мужчынам, складана летам. З аднаго боку — спякота, з другога — жанчыны ў кароценькіх спаднічках і дэкальтаваных кашулях і сукенках. Як такое вытрываць?

— Дык можа забараніць усім прадстаўніцам прыгожай паловы празмерна распранацца, выдаць наконт гэтага якую-небудзь пастанову? — зноў паспрабавала звесці ўсё на жарт.

Ён задумаўся, а потым яшчэ больш сур'ёзна вымавіў: «Дык гэта мы, мужчыны, наогул нічога не будзем бачыць? Я не згодны!».

«Вось што ні кажыце, а мужчыны — дзіўныя істоты! І так ім не гэтак, і гэтак — не так!» — падумала я, а вечарам падзялілася сваімі ўражаннямі ад дыялогу з сябрам. Але Віктар, замест таго, каб пажартаваць і пасмяяцца (як я таго чакала), узяў ды і... падтрымаў Віталя. Маўляў, чыстая праўда: летам назіраць аголеныя жаночыя формы (асабліва ў тых прыгажунь, якім ёсць што паказаць!) вельмі цяжка. Толькі на чым-небудзь сур'ёзным засяродзіш сваю ўвагу, а тут — раз! — зноў дэкальтэ перад вачамі!

— Асабліва складана на працы, — уздыхнуў Віктар, — таму правільна робяць у тых арганізацыях, дзе ўводзяць строгі дрэс-код. Не сакрэт, што вы, жанчыны, падкрэсліваеце свае прыгожыя формы спецыяльна — каб ад нас, мужчын, чаго-небудзь дабіцца. Напрыклад, прыбаўкі да заробку. Ці каб пазбегнуць крытыкі за якое-небудзь нявыкананае даручэнне...

І Віктар (дарэчы, ён працуе ў буйной арганізацыі, калектыў якой амаль цалкам складаецца з жанчын) у пацвярджэнне сваіх слоў расказаў гісторыю, як аднойчы яго супрацоўніца цалкам «завaліла» даручаную работу, а потым з'явілася на вочы кіраўніцтву ў вузенькай спаднічцы і з вельмі глыбокім дэкальтэ.

— Я быў такі раз'юшаны з-за нявыкананай работы, што думаў — задушу яе (жартуе, вядома ж!). Але калі яна з'явілася ў маім кабінеце ўся «такая-растакая» — нават не здолеў павысіць на яе голас. Бо, па-першае, як можна на такую прыгажосць лаяцца? А па-другое, быў заняты толькі тым, каб выпадкова не затрымацца надоўга позіркам на яе «галоўным гонары». Я ж кіраўнік — няёмка было б!

І гэта — не адзіны выпадак, калі жанчына-падначаленая маніпулявала кіраўніком для дасягнення якой-небудзь сваёй мэты. Мужчына наогул упэўнены, што прыгожыя жаночыя формы прадстаўніцам слабай паловы вельмі часта дапамагаюць у жыцці. Гэта як цяжкая артылерыя: толькі выкарыстаеш, як мужчыны адразу капітулююць. Бо не заўважаць усіх жаночых «акругласцяў» проста немагчыма.

«Трэба быць сляпым ці мёртвым, каб не бачыць!» — падкрэсліў Віктар.

А я вырашыла пацікавіцца, ці сапраўды жанчынам з прыгожымі формамі жывецца лягчэй.

«У пышных формах ёсць свае мінусы і плюсы, — расказала Ала, дзяўчына з вельмі адметнымі акругласцямі. — Я, напрыклад, вельмі рэдка апранаю дэкальтаванае адзенне (а на працу, наогул, ніколі), але заўсёды прыцягваю да сябе ўвагу, а іншы раз дзе-небудзь у кавярні проста хочацца спакойна пасядзець і пагутарыць з сяброўкай. Да таго ж не вельмі зручна... спаць. І адзенне не заўсёды падыходзіць да фігуры, таму часта прыходзіцца шыць кашулі і сукенкі на заказ».

«А вось я заўсёды выкарыстоўваю свае прыгожыя формы, калі мне трэба нешта атрымаць ад мужчыны, — гаворыць Вікторыя, — і сумленне маё пры гэтым не пакутуе. Затое мяне заўсёды хутка абслугоўваюць афіцыянты ў кавярнях, а ў крамах мужчыны-кансультанты таксама адразу звяртаюць увагу, нават не трэба нікога клікаць! І з мужам сваім я пазнаёмілася дзякуючы сваёй адметнасці...».

А жанчыны, у якіх формы не такія пышныя, звычайна злыя і раздражнёныя, упэўнена Вікторыя. Аднак з ёю не згодна Ірына, уладальніца акругласцяў «як ва ўсіх».

— І зусім я не злая, — гаворыць Ірына. — І ў жыцці ў мяне таксама ўсё ўдала склалася — добры муж, дзеткі. Ды і няпраўда, што мужчынам падабаюцца толькі вельмі пышныя жаночыя формы!

Ірыну падтрымаў мой знаёмы Яраслаў:

— Пышныя жаночыя формы — яшчэ не значыць прыгожыя. Асабіста я звяртаю ўвагу не на памер, а на, так бы мовіць, канфігурацыю.

Другі знаёмы, Аляксандр, наогул адказаў, што яму ўсё роўна: «Абы жанчына не захаплялася Лімонавым!».

— Зусім не мае значэння, якія ў жанчыны грудзі ці іншыя месцы, — такога меркавання прытрымліваецца яшчэ адзін Аляксандр. — Проста ты альбо хочаш быць разам з жанчынай, альбо не. Калі сэрца забілася часта і стала спякотна, то яна — твой варыянт. Калі кроў у венах застаецца халоднай — праходзь міма. Антрапаметрыя — вельмі зменлівая рэч. Талія можа заплыць тлушчам, грудзі пасля нараджэння дзіцяці — паменшыцца з пятага да першага памеру. Дык што, кінеш сваю жонку і пойдзеш шукаць іншыя «90-60-90»? Вельмі сумняваюся!..

Але так ці інакш, а ўсе мужчыны прызналі, што адметныя дзявочыя формы — важная частка жаночай прыгажосці, як і вочы ці валасы. Але закахацца ў нешта асобна — немагчыма. Закахацца можна толькі ў цэласны вобраз, калі ў жанчыне ўсё гарманічна спалучаецца: прыгожыя вочы, добрая душа і шчырае сэрца. «Вось ідзе такая прыгажуня, і ты разумееш: каралева!»

Гелена АВЕЛА

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Матуліны санатоўкі

Наладка біялагічнага гадзінніка

Медсястра раённай паліклінікі глыбакадумна гартала маю медыцынскую картку. І нарэшце з націскам на першыя словы вымавіла: «Вам 40 гадоў. Магчыма, у вас яшчэ будзе выкідыш». Ніякіх іншых падстаў, каб зрабіць падобную выснову, акрамя майго ўзросту, у яе не было. Я прыйшла ўсяго толькі стаць на ўлік па цяжарнасці. І, па шчырасці, дагэтуль не бачыла ў сваім становішчы нічога ненатуральнага.

А яны бачылі. Медсёстры і ўрачы (не ўсе, праўда, але такіх, хто лічыў маю цяжарнасць за драматычнае выпрабаванне, было ўсё ж больш). Мілыя калегі-жанчыны, якія імкнуліся ні на хвіліну не пакідаць мяне адну і наважваліся суправаджаць нават у метро (асабліва ў метро — гэта ж так небяспечна ў маім становішчы і ўзросце!). Газеты і інтэрнэт, што распавядалі пра агульнасусветную тэндэнцыю не спяшацца з нараджэннем першага дзіцяці, але адначасова амаль ніколі не забываліся нагадаць пра рызыкоўнасць падобнага рашэння і для маці, і для малога. Нават мой бацька-атэіст зрабіўся надзвычайна прымхлівым, услед за ўсімі нагадваючы, што ў мае гады... А ўрэшце, што ў мае гады? Да пенсіі яшчэ ой як далёка. Шкодных звычак не маю (ці паспяхова ад іх пазбавілася). З любымі ўласнымі (а часам і чужымі) праблемамі выдатна ўмею спраўляцца сама. Захоўваць душэўную раўнавагу ў любой сітуацыі навучылася (як, зрэшты, большасць маіх равесніц). Вартым мужам абзавялася, асобную ад бацькоў кватэру набыла (без дапамогі мужа, між іншым). Не так шмат гадоў таму амаль пад кожным з гэтых пунктаў я падпісалася б адмоўна. Дык што цяпер можа мне перашкодзіць свядома зрабіцца найлепшай маці?

І я вырашыла занатоўваць усё, што магло б пацвердзіць (ці абвергнуць) трываласць так званага «біялагічнага гадзінніка», на які так любяць спасылацца медыкі. Ды й не толькі яны. Хаця б таму, што навокал мяне процьма знаёмых маладых жанчын крыху за 30, якія даводзяць сябе да нервовага зрыву, уяўляючы адзінокую старасць у абдымках з коткай. Бо патэнцыяльны прынц і бацька будучых дзяцей усё яшчэ блукае недзе за гарызонтам, а «біялагічны гадзіннік» адлічвае быццам апошнія хвіліны... Ці ўсё так драматычна насамрэч?

Як высветлілася на практыцы, бывае па-рознаму. Але яшчэ пытанне, ці ўзрост таму прычынай.

Прызнаюся, наконт узросту я ніколі не мітусілася. Магчыма, таму, што маё першае працоўнае месца аказалася побач з крэслам 46-гадовай жанчыны, якая тады толькі што выйшла з дэкрэтнага адпачынку. Пра розныя там фітнэсы, дыеты і іншыя модныя штукі для падтрымання здароўя і маладосці яна ведала вельмі прыблізна. І жыццё ў яе было вельмі няпростым. Але панурай, без усмешкі я не бачыла яе ніколі... За ўсе гэтыя гады яна зусім не змянілася. Хаця расціць сына, так ужо сталася, ёй выпала адной. Сын вырас усім на зайздрасць. І напярэдсе ў яе, упэўнена, яшчэ шмат паўнавартасных гадоў. Бо сапраўдны ўзрост, як пераканала мяне знаёмства з гэтай кабетай, не залежыць ні ад пашпартных лічбаў, ні ад колькасці гадзін, праведзеных у спартыўнай зале. А вось колькасць шчырых (абавязкова шчырых) усмешак на працягу дня адчувальна знізжае ўзроставую планку.

Урэшце, калі ўпэўненасці ў сваіх «узроставых» здольнасцях нарадзіць дзіця бракуе, можна пацікавіцца і біяграфіямі вядомых асоб. Яфім Шыфрын, напрыклад, з`явіўся на свет, калі яго маці было ўжо добра за 40. Каханне і, пэўна ж, здароўе яго бацькоў (дарэчы, абое родам з Магілёўскай губерні) прайшло выпрабаванне гадамі сталінскіх рэпрэсій. І ўзровень медыцыны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя (тым больш, на Калыме) наўрад ці прыстойна параўноўваць з сённяшнім. Але...

Тым не менш адных славутых біяграфій для ўзняцця настрою мне не хапіла, калі мы з мужам вырашылі, што цалкам гатовы да бадзёрых танцаў па начах у кампаніі немаўляці. Бо нічога істотнага ў нашым жыцці не адбылося ні праз месяц, ні праз паўгода, ні пазней. Я захапілася збіраннем народных рэцэптаў з мэтай як мага хутчэй прывабіць жаданую падзею. З самых экзатычных, што мне трапіліся, — парада пры любым зручным выпадку прыкладаць да жывата кавуны. Чым больш прыкладзеш — тым лепш. Яшчэ кажуць, што карысна як мага часцей пытацца ў пузатых мужчын (!), колькі гадзін. А яшчэ няблага завесці дома фікус... Фікус я завяла. І пачала рыхтаваць мужа да думкі, што калі-небудзь мы, напэўна, маглі б узяць дзіця на выхаванне. Спачатку ён пра гэта і слухаць не хацеў. Пакуль да нас у госці не завітала мая былая аднакласніца, якая напярэдадні якраз забрала дзяўчынку з дзіцячага дома. Муж быў настолькі зачараваны гэтай малой, што сам прапанаваў: «Заўтра ж едзем у дзіцячы дом!» Але назаўтра я захварэла. З высокай тэмпературай, цяжкай галавой і іншымі сімптомамі звычайных восеньскіх вірусаў. Застаўшыся дома, вырашыла прыбраць кватэру. І выпадкова натрапіла на нескарыстаны тэст на цяжарнасць... Словам, так выпадкова ўсё і адбылося.

А калі пазней мая сяброўка ў чарговы раз пачала скардзіцца, што вар'яцее ад свайго жадання нарадзіць дзіця, я параіла ёй для пачатку пацікавіцца працэдурай усынаўлення ва Украіне (там сяброўка зараз жыве). Проста каб зразумець, што заўжды ёсць альтэрнатыва. І нават калі вам «глыбока за 40», у вашага дзіцяці яшчэ цалкам можа з'явіцца брат ці сястра. І зноў глядзець на свет дзіцячымі вачыма вы будзеце ў любым выпадку... Дарэчы, хочаце — не верце, але неўзабаве сяброўка зацяжарала.

Марына БЕРАЗЕНСКАЯ

■

■ Свет прыгажосці

ДОБРЫ ЦЫРУЛЬНІК — ЯКІ ЁН?

Каму не знаёмае гэтае горкае расчараванне пасля наведвання цырульні: «Я ж прасіла толькі падраўняць, дык адкуль выгаленая патыліца і рваны вожык на макушцы?..» Так, знайсці ўзаемапаразуменне з цырульнікам — цяжкая, але надзвычай важная задача. Бо пад уладай чараўніка з нажніцамі аказваецца не проста капа вашых валасоў. На карту пастаўлена ўсё: прыгажосць, настрой, самаацэнка. І ўсё гэта правальваецца ў пекла, калі вас абірычылі-абрэзалі. Французанкі нават жартуюць, што знайсці добрага цырульніка часам больш складана, чым паспяхова выйсці замуж. Бо «выбраннік» павінен быць адначасова мастаком, псіхолагам і, безумоўна, сапраўдным профі. Як пазбегнуць памылак і расчаравання?

Першым прапануем такі варыянт пошуку «свайго» цырульніка. Запішыцеся на ўкладку да таго майстра, які імпануе вам знешне. У салон прыйдзіце не ў прызначаны час, а хвілін на 15—20 раней. Так вы, хутчэй за ўсё, зможаце паназіраць за спецыялістам падчас працы. Калі не спадабаецца — смела сыходзьце і шукайце далей. Калі ж стрыжка папярэдняга кліента прыйшлася вам даспадобы, а працэс яе стварэння выклікаў захапленне — сядайце ў крэсла. Магчыма, гэта і ёсць «ваш» майстар. Вядома, такі спосаб пошуку можа заняць шмат часу, але перавага яго ў тым, што вам не сапсуюць валасы і выбар ваш будзе ўсвядомленым.

Можна скарыстацца і парадай сяброўкі. Калі, вядома ж, яна сапраўды добра падстрыжана і дагледжана. Але ўсё ж моцна абнадзейвацца не варта. Цалкам магчыма, што ў вас з ёй розныя густы і ў плане прычосак, і ў плане абслугоўвання.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таксама вызначыцеся: вам патрэбен майстар, які робіць сваю справу хутка і ў адпаведнасці з вашымі задумкамі, або той, які працуе грунтоўна, але пры гэтым праяўляе фантазію. У першым выпадку вы будзеце застрахаваны ад непрыемных нечаканасцяў, у другім — станеце ўладальніцай унікальных прычосак, якіх няма ні ў адной з вашых аднакурсніц ці калег.

Знайсці добрага цырульніка дапамогуць і наступныя нашы парады.

✓Майстар сваёй справы ніколі не стане набіваць сабе цану, прыніжаючы пры гэтым калегу, які працаваў над вамі да яго. Калі майстар пытаецца: «Хто вас так жудасна падстрыг?», «Вы наогул бачылі, што ў вас на галаве?» або выказвае заўвагі ў стылі: «Такому «спецыялісту» трэба рукі паадбіваць!», пытанне аб тым, як выбраць цырульніка, павінна зноў для вас стаць актуальным.

✓Добры цырульнік спачатку ўважліва выслухае вашы пажаданні, а ўжо потым пачне даваць парады па выбары стрыжкі або афарбоўвання. (Дарэчы, стваральчы прычоску, майстар не павінен ва ўсім слухацца кліентку, калі тая не мае рацыі. Напрыклад, калі жанчына просіць пастрыгчы яе коратка, а ён ведае, што ў такім выпадку валасы будуць ляжаць дрэнна і прычоска атрымаецца непрыгожай, ён павінен патлумачыць гэта кліентцы. Словы «Вы самі так папрасілі...» для сапраўднага майстра недапушчальныя.)

✓Прафесіянал абавязкова пацікавіцца, як часта вы мыеце валасы, ці шмат часу ідзе на ўкладку, якімі сродкамі для догляду валасоў вы карыстаецеся. Так спецыяліст зможа ўлічыць вашы звычкі пры выкананні працы. Ён паклапоціцца не толькі пра тое, як вы будзеце выглядаць, выйшаўшы з салона, а падумае і над тым, як стрыжка будзе глядзецца штодня, ці зможаце вы самастойна яе ўкладваць.

✓Улічвайце і тое, што сучасныя тэхнікі стрыжак выконваюцца толькі на вымытыя валасы. Калі майстар не прапанаваў вам зрабіць гэта — не чакайце добрага выніку.

✓Працэс выканання прычоскі павінен прыносіць вам задавальненне. Сапраўдны спецыяліст валодае інструментам свабодна, за яго працай прыемна назіраць збоку.

Звяртайце ўвагу на дробныя, але таксама вельмі важныя моманты:

✓Цырульнікі — народ творчы, таму некаторыя асобы выглядаюць вельмі незвычайна. Нягледзячы на гэта, знешні выгляд майстра павінен быць ахайным.

✓Інструменты добрага спецыяліста чыстыя і стэрылізаваныя, а на расчосцы няма валасоў папярэдніх кліентаў.

✓Цырульнік павінен выкарыстоўваць аднаразовыя каўнерыкі, а не прышпільваць пеньюар да голай шыі наведвальніка.

✓Прафесіянал не стане прасіць кліента прычасаць сябе самастойна або высушыць галаву, а таксама падаць фольгу або бігудзі.

І яшчэ. Сертыфікаты і ўзнагароды, атрыманыя на курсах павышэння кваліфікацыі і на конкурсах, сведчаць пра майстэрства цырульніка. Але памятайце: паслугі такога майстра абыдуцца значна даражэй.

Што ж павінны зрабіць вы для таго, каб аблегчыць працу майстра і атрымаць пры гэтым добрую прычоску?

Напярэдадні наведвання цырульні вымыйце валасы і ўстрымайцеся ад старанной укладкі. Так майстар зможа ўбачыць недахопы росту валасоў (напрыклад, віхуры, непрыкметныя ва ўкладцы) і ўлічыць іх у працэсе працы. Вядома, падчас афарбоўвання ваша цела і вопратку ад фарбы будзе абараняць пеньюар, але ўсё ж не апранайце ў салон тое, што баіцеся сапсаваць. Калі робіце прычоску ўпершыню, загадзя паспрабуйце знайсці ў інтэрнэце фота з жаданай стрыжкай, укладкай ці афарбоўкай.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ

■

■ Яго маці

СВАЯ КРОЎ? ЦІ... ТАЯ, ЯКАЯ ВЫП'Е ЎСЮ КРОЎ?

Паводле статыстычных даных, з-за ўмяшальніцтва свекрыві ў адносіны сямейнай пары распадаецца кожны восьмы шлюб у свеце, а паводле некаторых даследаванняў — нават кожны другі. Вось чаму так важна знайсці ўзаемапаразуменне з мамай мужа. Дасягнуць гэтага бывае вельмі складана, але, як лічаць спецыялісты, усё ж такі магчыма.

«ЯНА ЗАЧАРАВАЛА МАЙГО СЫНА!»

Святлане Сцяпанаўне нявестка не спадабалася з першага позірку. Як увайшла тая разам з сынам упершыню ў іх дом, так з таго часу і пачала раздражняць свякроў сваёй прыстунасцю ...

Спачатку Святлана Сцяпанаўна, мабыць, спадзявалася, што Ілона — гэта ўсяго толькі чарговая сяброўка яе Кірыла. Іх у жыцці сына ўжо было нямала, але ніхто не здолеў затрымацца. Таму жанчына толькі ветліва ўсміхалася чарговай дзяўчыне, а пра сябе заўжды думала: «Вось дурніца! Куды ёй да майго Кірыла?.. Яна ж яму — не пара, але на нешта ж спадзяецца». Толькі з Ілонай атрымалася ўсё інакш. Аднойчы Кірыл заехаў да маці і паведаміў, што яны збіраюцца пажаніцца. Ад нечаканасці Святлана Сцяпанаўна нават не здолела нічога сказаць.

Вядома, яна разумела, што рана ці позна ў жыцці сына з'явіцца нехта, хто яго «акруціць», але каб Ілона?!. У гэты дзень, які для маці стаў адным з самых змрочных у жыцці, яна не здолела заснуць амаль да раніцы. А на досвітку ёй падумалася: няхай сабе жэняцца, але яе Кірыл усё роўна не зможа жыць з такой, як Ілона. Адразу ж відаць — беларучка! Мабыць, і гатаваць як след не можа, не тое што падтрымліваць утульнасць у доме. А мужчынам догляд патрэбны, і пры гэтым каб жонка была заўсёды добрай, вясёлай, пяшчотнай. «Не, Ілона доўга не вытрывае», — вырашыла для сябе Святлана Сцяпанаўна.

Адгулялі вяселле, прайшоў месяц, другі, трэці... А сын хадзіў такі ж шчаслівы і закаханы!.. Святлана Сцяпанаўна адчула сябе падманутай. «Гэтая змяюка, мабыць, зачаравала майго сына!» — думала жанчына. І з кожным днём усё больш ненавідзела нявестку. Дайшло да таго, што ёй стала балюча нават бачыць Ілону побач з Кірылам...

«ЯНА НЕ ЖАДАЕ ЯМУ ШЧАСЦЯ!»

Зразумець, за што яе так не любіць свякроў, Ілона не магла. А тое, што яе не выносяць, дзяўчына адчула амаль адразу пасля знаёмства з будучай свекрывёю. А калі яны з Кірылам ажаніліся, дык свякроў нават перастала ўтойваць свае сапраўдныя адносіны да нявесткі.

«Калі мы разам прыязджалі да яго маці, яна нават мянялася з твару, як толькі бачыла мяне побач з сынам», — расказвае Ілона.

Чаго толькі маладая жонка ні рабіла, каб паладзіць з маці мужа: рабіла ёй падарункі, прывозіла дарагія прадукты, праз дзень тэлефанавала, каб тая не адчувала сябе кінутай. Нават аднойчы запрасіла Святлану Сцяпанаўну ў тэатр. Ды толькі нічога не давала вынікаў.

Ілоне нават здавалася, што чым больш яна спрабуе наблізіцца да маці мужа, тым больш тая аддаляецца ад яе. А калі ў маладой пары нарадзілася дачушка, Святлана Сцяпанаўна наогул больш за тыдзень не падыходзіла да тэлефона.

«Здаецца, усё раблю як след, муж з дачкой заўсёды дагледжаныя, накормленыя... У кватэры чысціня — усё зіхаціць! За сабой таксама заўсёды сачу: і прычоска, і макіяж, і прыгожая сукенка кожны дзень, каб Святлана Сцяпанаўна не гаварыла Кірылу, што я страшыдла! За што яна мяне так не любіць — не разумею, — шчыра прызнаецца Ілона. — Няўжо яна не бачыць, што ў нас з Кірылам усё добра? Што ён мяне кахае?.. Няўжо не жадае шчасця свайму сыну?..»

Ужо амаль пяць гадоў Ілона і Кірыл разам і шчаслівыя ў шлюбе, а свякроў не змяніла свайго стаўлення да нявесткі. Ілона ж, страціўшы ўсялякую надзею на паразуменне, вырашыла, што лепшы сродак не псаваць сабе настрой, захаваць унутраны спакой — гэта наогул не бачыцца са свекрывёю. Не таму, што Ілона не любіць Святлану Сцяпанаўну, а таму, што так будзе лепш для ўсіх. У першую чаргу для Кірыла і Святланы Сцяпанаўны.

«Я Ж — ТАКАЯ, ЯК ЯНА!»

— Няўжо не крыўдна, што яна да цябе так ставіцца? Прызнайся, ты ж яе, пэўна, таксама ненавідзіш?! — правакую Ілону.

А тая ў адказ толькі ўсміхаецца:

— Ты ж усё роўна не паверыш, што я ёй... сімпатызую, ды і як інакш?.. Гэта яна выхавала такога цудоўнага сына. Няхай свякроў мяне не любіць (хаця, безумоўна, крыўдна!), затое побач са мной верны, добры і пяшчотны мужчына, і такім ён стаў дзякуючы яе ўплыву. Ды і, шчыра кажучы, я на Святлану Сцяпанаўну вельмі падобная. Аднойчы знайшла ў альбоме мужа здымак, дзе яны разам з маці адпачывалі ў Крыме, дык нават спужалася нашага з ёю падабенства. Яна там крыху старэйшая за мяне цяперашнюю, але... такая прыгожая, так шчыра ўсміхаецца! Пэўна, недарма кажуць, што сын выбірае жонку, падобную на сваю маці...Дарэчы, існуе меркаванне, што менавіта падабенства свекрыві і нявесткі часцей за ўсё і становіцца падставай для нелюбові паміж жанчынамі. Спецыялісты тлумачаць гэтую з'яву так. Калі нявестка мае такі ж моцны характар, як і свякроў, то сутычкі паміж імі — гэта толькі справа часу. Канфліктаў у гэтай сітуацыі пазбегнуць амаль немагчыма. Свякроў і нявестка нават могуць не разумець, што з'яўляецца сапраўднай падставай для нелюбові — яны не любяць адна адну падсвядома. Проста дзвюм моцным жанчынам цесна ў жыцці аднаго мужчыны, які для адной — сын, «заўсёды маленькі хлопчык», а для другой — каханы муж, ідэал мужчыны.

Калі свякроў і нявестка аднолькава слабыя, пяшчотныя, мяккія па характары, то яны амаль заўсёды знаходзяць паразуменне. Але пры гэтым спецыялісты папярэджваюць маладых жонак, што станавіцца сяброўкай свекрыві ўсё ж не трэба. Бо як бы цудоўна ні ставілася да нявесткі свякроў, якімі б добрымі ні былі паміж імі адносіны, сын заўсёды будзе для мамы бліжэй.

Што ж рабіць, калі час ідзе, а адносіны са свякроўю не складваюцца?.. Дыстанцыравацца, а потым... проста чакаць, калі свякроў змірыцца, што вы ў жыцці сына назаўсёды і ў вас усё цудоўна ў шлюбе. Можна, вядома, і не дачакацца змен да лепшага ў стаўленні свекрыві. Але звычайна з цягам часу, калі свякроў бачыць, што ўнукі растуць, сям'я не распадаецца, а сын задаволены — яна змяняе гнеў на міласць і нават пачынае ставіцца да нявесткі з сімпатыяй. Проста адным свякроўкам на гэта спатрэбіцца год, іншым — пяць, а камусьці — амаль усё жыццё. Так ці інакш, а канфліктаваць са свекрывёю (і гэта абсалютна дакладна!) — занятак шкодны і непатрэбны. Тое, кім яна для вас стане — «сваёй крывёю» ці «той, якая вып'е ўсю кроў», — залежыць у значнай ступені ад вас, а не толькі ад яе. Дык дайце маці вашага мужа шанц стаць для вас калі не такім жа родным чалавекам, як вашы бацькі, дык хаця б — не чужым!..

Алена КАВАЛЁВА

■

КАЗАЛІ АДНО...

Гадоў з пяцьдзясят таму мой добры сябар Віктар Луцкі вучыўся ў Беларускім лесатэхнічным інстытуце і, як многія тады, летам ездзіў на асваенне цаліны. Студэнтаў выкарыстоўвалі там як недарагую рабочую сілу, сялілі, як правіла, у бараках. У той год, напрыклад, у вялікім — жыло сорак хлапцоў, а ў прыбудове да яго — 12 дзяўчат.

Дык вось. Аднойчы ў час абедзеннага перапынку студэнты селі гуляць у карты і вельмі ж захапіліся: не згледзелі, адкуль на небе з'явілася хмара, адкуль паліўся дождж... Ды гэтакі спорны, у спёку...

Карацей, хлопцы нічога ўцяміць не паспелі ды толкам агледзецца, як новая навіна: з дзіркі ў даху выскачыў нейкі вогненны шарык памерам з курынае яйка і... як бабахне! Хлопцы, можна сказаць, узляцелі з лавы, прыўзняліся ў паветра...

Шаравая ж маланка не зачапіла, дзякаваць Богу, нікога. Толькі напалохала, бо піск у дзявочай прыбудове пачаўся проста неймаверны!

Хлопцы, вядома ж туды — на галасы, на выручку. А там...

Студэнткі, напаўголыя (ведама, духата), як звар'яцелыя носяцца паміж ложкаў, крычаць, вішчаць...

І толькі адна, самая прыгожая, пастарэчы абхапіўшы галаву рукамі, хістаецца ў бакі і ў страшнай роспачы паўтарае: «Усё... Я глухая... Я зусім глухая... І хто ж мяне замуж такую возьме?..»

Як высветлілася, тая шаравая маланка найперш ударыла ў прыбудову і дзяўчат мала таго што напалохала — яшчэ і аглушыла! Прычым настолькі, што спачатку яны нічога не чулі.

...Віктар, успамінаючы гэты «цалінны» выпадак, заўсёды смяецца. Найбольш з таго, што ўсе дзяўчаты спявалі «Раньше думай о Родине...», выдавалі сябе за вельмі эмансіпаваных і ідэйных, гаварылі, наколькі важна для іх скончыць вучобу, здзейсніцца ў прафесіі, уступіць у партыю, зрабіць кар'еру...

А напраўду, як высветлілася, усе яны хацелі замуж. І вельмі баяліся, што з нейкімі недахопамі іх проста могуць не ўзяць.

Уладзімір Шулякоўскі,
г. Мінск

...А МАГЛО БЫЦЬ ІНАЧАЙ!

У пачатку 1970-х гадоў райкам партыі накіраваў мяне на пасаду дырэктара вясковай сярэдняй школы. Ехаць на новае месца мне, шчыра кажучы, не вельмі хацелася, ды нічога ж не зробіш — партыйная дысцыпліна. Так я апынуўся ў вёсцы Юркевічы, прыжыўся тут, жыву, цяпер на пенсіі ўжо, а тады працаваў, дзе загадалі і, вядома ж, па розных службовых абавязках нярэдка ездзіў па навакольных вёсках, бо дзеці ў школе з усёй акругі... Часта бываў і ў райцэнтры.

Дабіраўся туды як прыйдзецца: калі аўтобусам, калі пехатой, калі на нейкіх спадарожных падводах-машынах... А нарэшце змогся — вырашыў купіць аўтамабіль. Грошай трохі было сваіх, трохі дапамаглі бацькі. І вось, нарэшце, у мяне свая машына — навюткі «Запарожац»!

...На ім якраз вяртаюся неяк з райцэнтра. Бачу — галасуе аднавясковец. Яго Мішам звалі, а мянушка — Спелы (мусіць, таму, што твар у яго заўсёды чырвоны).

Вядома ж, я прыпыніўся, падабраў — чалавек сеў, едзе. І пры гэтым, не паверыце, мяне ж... папракае (ведама, п'яны). Кажа:

— Бач, Мікітавіч, як ты разбагацеў тут, у нашай вёсцы, як распаneў. Ведама — дырэктар! Ужо пешкі і не ходзіш, ужо машыну сабе прыдбаў...

— Так, — згаджаюся, — я распаneў, я прыдбаў... А ты, Міша, мне па праўдзе скажы: колькі ты прапіў вось такіх «Запарожцаў»? (Бо я ж ведаю, што працаваў ён бульдазерыстам, асушаў Палессе... Грошы заграбаў, можна сказаць, каўшамі — іншаму начальству не снілася... І калі б не піў...).

Думаў, пакрыўдзіцца ён. Гляджу — не: сапраўды звіліны «ў кучку сабраў», пальцы загінае — лічыць, зводзіць даходы з расходамі! І праз хвілю нават лічбу выдае:

— Ну, не менш як два!

— Значыць, — кажу, — мы на роўных: ты атрымаў задавальненне ад таго, што дзве машыны прапіў, я — ад таго, што на адной езджу і не залежу цяпер ні ад аўтобуса, ні ад надвор'я... Ды яшчэ і цябе вось падвожу. А магло быць — наадварот. Ты, Міша, падумай...

Як педагог са стажам скажу: калі б Мішу гэтую думку нехта падкінуў раней, можа, ён і зрабіў бы нейкія высновы, можа, не быў бы Спелым?

Васіль Пяшэвіч,
в. Юркевічы,
Жыткавіцкі раён.

ЗНАХОДЛІВЫ ХЛОПЕЦ

...Пятрок вельмі спяшаўся на спатканне. Таму замест вячэры нагбом выпіў вялізны кубак кефіру ды жвава пабег у бок старога парку.

Арына чакала яго, як звычайна, пад кучаравымі ліпамі. Увечары там на дзіва ўтульна і камфортна. Але ж на гэты раз сядзець на лаўцы дзяўчына не хацела, адразу ж прапанавала пагуляць ля рэчкі.

Пятро згадзіўся, бо таксама не супраць быў пахадзіць, падыхаць свежым паветрам, адпачыць яшчэ і душой.

Яны прайшліся ўжо туды-сюды, пагаманілі, нават крыху пажартавалі. Але праз нейкі час юнак адчуў, што яму зусім не да смеху. У яго арганізме стала адбывацца нешта не тое: кішкі, што называецца, ігралі марш, жывот гудзеў, як той бубен!

Пятро з усіх сіл імкнуўся затармазіць, заглушыць гэтыя вулканічныя працэсы, ён трымаўся, як мог, але... спатыкнуўся — і тут жа прагрымеў выбух.

Хлопец спалохана зірнуў на дзяўчыну: пачула? Як быццам не? Але ж ён на ўсякі выпадак хацеў падстрахавацца. І нават знайшоў, што сказаць. Паказаў рукою на неба: чуеш, маўляў, дзесьці грыміць? Можа, і дождж зараз будзе? То пойдзем, пасядзім дзе ў кавярні.

Дзяўчына задрала галаву і, заўважыўшы ў небе чорную хмарку, згодна кіўнула галавой.

Хлопец з палёгкай уздыхнуў: значыць, пранесла?

Ганна Атрошчанка,
г. Гомель

«ДАВАЙЦЕ ВЯСЁЛАЕ!»

Пра сучасныя песні гаварыць не хочацца, бо ў іх мала што мелодыі ніякай, дык яшчэ і зместу няма. «Твои глаза — два бриллианта, три карата» — гэта, як зазначыў гумарыст Задорнаў, проста жах, бо свіныя ж вочкі...

А вось даўнейшыя песні — яны вельмі прыгожыя, вельмі мілагучныя, хоць словы ў іх (тут я зноў пагаджуся з Задорнавым) не заўсёды супадаюць з мелодыяй. Кожны, мусіць, чуў, а то і сам спяваў: «И за борт её бросает в набежавшую волну...»?

Гэта ж, згадзіцеся, пра забойства! Гэта ж трагедыя, жах — тут плакаць трэба! А выканаўцы — не: яны ў тыя хвалі быццам купальскі вяночак укінулі.

Ці вось яшчэ казакі спяваюць вельмі прыгожую песню «Ванька Ключнік» (дарэчы, на словы паэта Крастоўскага) «...А княгіня молодая умирает на ноже». Зноў жа трагедыя, зноў жах! А спяваюць — вельмі весела. Да таго ж яшчэ і прысвістваюць...

Зрэшты, гэта так, да слова, што неяк сабраліся нашы вясковыя бабулі песні паспяваць. І адну зацягнулі, і другую, і трэцюю. Ды ўсё нешта сумныя... Кшталту: «Жыву я ад маменькі далёка, мне не з кім прывету перадаць...». Альбо «Зялёная вішня» — са словамі: «Няма табе, донька, ні лыжкі, ні міскі»...

Карацей, і паспявалі яны як быццам, а на душы не палягчэла, не адлягло. «До, — рашылі, — давайце нешта вясёлае!»

І песню ўмомант знайшлі! Якую? Ды як дзед бабу тапіў... Помніце: «А як баба ўзнырне, дык дзед кіем падпіхне...»

І не шкада яе! Можа, таму, што дрэнная баба? А можа, таму, што ў песні вельмі ўжо вясёлая мелодыя!

Соф'я Кусянкова,
в. Лучын, Рагачоўскі раён
Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Пытальнік

«Калі некаму трэба, завязём пробы ў Мінск»

Паважаная рэдакцыя! Просім вас даць адказ на наша пытанне. Быў у суседняй вёсцы свінакомплекс. Потым яго выкупіў нейкі фермер. Дык вось людзям цяпер забараняюць трымаць свіней, каб абараніць той комплекс. Мы ўсе ў шоку: як жыць? Свінні не хварэюць, а іх прымушаюць збываць. Кароў у вёсцы няма ніводнай, краму закрылі. Трымалі свіней, было хоць трохі лягчэй. Гаспадар мой ляжыць у ложку без нагі пасля інсульту...

Т.К. Дубень, в. Шчонава Карэліцкага раёна.

Мы ўжо неаднойчы паведамлялі, што, у адпаведнасці з ветэрынарна-санітарнымі правіламі вырошчвання свіней, фізічным асобам забаронена іх утрыманне ў радыусе не менш за пяць кіламетраў ад свінакомплексаў.

— А ад свінакомплекса, што размешчаны побач, да вёскі Шчонава няма і трох кіламетраў, — паведаміў на наш запыт галоўны ветэрынарны ўрач Карэліцкай ветстанцыі Уладзімір Занько. — Колішні свінакомплекс некалі выкупілі, зараз там вельмі добрая ферма, утрымліваецца 8 тысяч свіней. Мы прайшліся па дварах, патлумачылі сітуацыю... Але незадаволеныя ёсць. Людзі пішуць, скардзяцца. Я цалкам разумею вяскоўцаў. Але што ж рабіць, калі вакцыны ад чумы няма? Таму і трэба пазабіваць свіней. Мы гатовы, калі некаму патрэбна, правесці аналіз прадукцыі забою: звазіць пробы на праверку ў Мінск. А на трыхінелёз можам даследаваць свініну самі. Патлумачылі таксама людзям, што пасля забою свіней нельга заводзіць шэсць месяцаў і яшчэ шэсць — устрымацца ад іх развядзення. Фактычна забарона на ўтрыманне складае год. Калі ўсё будзе добра, за гэты час вірус павінен сысці. Забой свіней — вымушаная мера, але іншага выйсця няма. Зараз сітуацыя ў раёне знаходзіцца пад кантролем ■

ПА ШЧАСЦЕ Ў КОСАВА

У невялікае мястэчка Косава, што на поўдні Беларусі, прыязджаюць маладыя з усіх рэгіёнаў Брэстчыны: вельмі прыгожыя тут краявіды. На фоне гэтага харастваможна проста пафатаграфавацца і нават абраць шлюб. Тут аднаўляюць Палац Пуслоўскіх, ці, як яго часта называюць, Косаўскі замак — помнік архітэктуры першай паловы XIX стагоддзя.

Палац у Косаве быў пабудаваны ў 1838 годзе, а ў 1914 -м — цалкам разрабаваны і пасля спалены. Да нашых дзён захаваліся толькі сцены некалі квітнеючага маёнтка. Цяпер праводзіцца рэканструкцыя Косаўскага замка, які знаходзіцца пад абаронай дзяржавы. І хоць рэканструкцыя яшчэ не завяршылася, маладыя з задавальненнем прыязджаюць сюды, каб зрабіць хаця б адзін фотаздымак на фоне прыгожага замка.

На фота: Марына і Дзмітрый МАДОНАВЫ прыехалі ў свой святочны дзень, каб сфатаграфавацца на фоне замка.

Марына БЕГУНКОВА. фота аўтара.
Івацэвіцкі р-н.

■ Лёс чалавека

ЖЫЦЦЁ, ЯКОГА НЕ БЫЛО

Цёплае вясновае сонца хілілася да гарызонту. Май уладарыў напоўніцу, надвор'е было як летам... Хоць яблыні яшчэ не цвілі, а значыць, чакай маразоў?

Вось такой мілай сэрцу парою маладая пенсіянерка Вольга прыехала ў бацькоўскую хату, у вёску. Тут яна нарадзілася, тут адбегала свае пятнаццаць першых і лепшых гадоў, тут скончыла школу-васьмігодку. Адсюль падалася ў горад, кінулася ў вір сталічнага жыцця. Аднак і там яно ішло па раскладзе, нібы тыя электрычкі, якімі яна прыязджала да бацькоў. Ну як жа: пасля школы — вучылішча, спецыяльнасць маляра-тынкоўшчыка, праца — дзень пры дні, ад выхаднога да выхаднога. Будавала яна — школы, дзіцячыя садкі, дамы-шматпавярховікі.

Каб потым, у адным з такіх мурашнікаў ужо з мужам Васілём атрымаць кватэру. Каб у адзін з садкоў (а потым і ў школу...) павесці сынка. Яны галубком яго называлі. І, вядома ж, песцілі. Для яго найперш, для Алёшачкі, купляліся прысмакі і ўсе абноўкі. А што — яны малымі хлеба ўдосталь не ведалі, пра цукеркі-падушачкі толькі марылі, дык няхай хоць дзіця ад'есца... Адзінае ж...

Можа, тады яны нешта ўпусцілі, недзе памыліліся? Але ў мужа пра гэта ўжо не спытаеш: чатыры вясны як не стала яго, пахавала... І толькі тады зразумела, як жа любіла. А пры жыцці...

Пра каханне адно аднаму яны, былыя вясковыя дзеці, неяк не казалі, няёмка было. Проста сышліся, разам пражылі маладосць, потым у тлуме гарадскім, у працы і клопатах сустрэлі сталасць. А вось старасць — яе Васіль ужо не паспеў, памёр.

Вольга часам зайздросціла яму, бо з ёй, як лічыла, адбылося нешта страшнейшае, чым нават смерць.

Спакваля пачыналася: сын ажаніўся, прывёў у кватэру нявестку. Ім, як быццам, і не цесна было: маладыя ў адным пакоі, яна — у другім. Вось толькі рамонт бы неяк зрабіць.

Патрэба ў ім, вядома ж, была. Ці не ўсе суседзі ўжо паставілі шклопакеты, памянялі дзверы ў пакоях, павыкідвалі стары лінолеум, плітку... Яны таксама вырашылі — як толькі пацяплее...

Не, сын нядрэнна прыдумаў: яны з жонкай усе турботы возьмуць на сябе. А маці, каб не дыхаць рамонтным пылам, на лета пераедзе ў вёску.

Вольга згадзілася: балазе, гэта недалёка, ды і тэлефон у суседзяў ёсць: можна званіць, можна распытваць, як справы...

Аляксей, як падавалася, ахвотна расказваў. І Вольга пасля кожнай размовы не магла на яго нахваліцца, не магла нацешыцца — не магла не ганарыцца сабой, нябожчыкам-мужам, бо нічога ж не скажаш: хлопец вырас талковы, з галавой, з рукамі. І бач які дзелавы, як разгарнуўся...

З пачатку жніўня яна ўжо прапытвала, калі ж закончацца ўсе работы, калі ёй можна будзе вярнуцца дамоў. Сын тэрмінаў не называў, проста пералічваў, што яшчэ засталося зрабіць...

А ў першую суботу верасня ля яе вясковай хаты раптам спыніўся грузавік. Яна сцяміць нічога не паспела, як з яго трое дзябёлых хлопцаў згрузілі добра знаёмую старую мэблю і нейкія вандзэлкі, укінулі ўсё ў хату і... зніклі.

Вольга так разгубілася, што нічога не паспела спытаць. Потым, калі машына ўжо схавалася за паваротам, кінулася да суседзяў: ну як жа — трэба пазваніць сыну. Ён, відаць, і мэблю рашыў памяняць і старую, каб не выкідваць...

Тое, што ад яго пачула, перазвонам загрымела ў вушах: «Ты ведаеш, мама, табе трэба застацца ў вёсцы. Там табе лепей будзе: і здаравей, і прасторней. Тут жа нам і ўтраіх не павярнуцца было... А народзіцца хутка малое... Ты не сумуй там... Мы будзем прыязджаць...»

За цэлы доўгі, як вяроўка год аніхто да яе так і не прыехаў. Сына — адзінага, любімага — як не было... І з часам жанчыне стала здавацца, што адсюль, з вёскі, яна нікуды не з'язджала, што ўсё тое гарадское жыццё пражыў нехта іншы, а ёй пасля 15 споўнілася не 16, 17, 18 — адразу 57. І трэба дыхаць, трэба хадзіць па зямлі, трэба неяк падладзіць хату, каб не мерзнуць, як летась, і не хварэць, трэба паправіць печку і назапасіць дроў...

Новыя справы запаўнялі яе час, а галоўнае — думкі.

Сяргей КОНАН.
г. Жодзіна

Правила проведения рекламной игры
«С «Марко» всегда на «десяточку»

Настоящие Правила проведения рекламной игры «С «Марко» всегда на «десяточку» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «С «Марко» всегда на «десяточку» (далее – Игра).

1. Организатор Игры.

Организатором Игры является Частное предприятие «Сан Марко», УНП 800018165 (далее — Организатор), зарегистрированное Решением Администрации Октябрьского района города Витебска 13 мая 2010 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800018165.

Юридический адрес: 210026, г. Витебск, проспект Людникова, д. 10.

Тел. (0212) 54-90-31.

2. Наименование Игры – «С «Марко» всегда на «десяточку».

Игра осуществляется в соответствии с настоящими Правилами с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

3. Срок и территория проведения Игры.

Игра проводится с 19 августа 2013 года по 30 сентября 2013 года в фирменных магазинах «Марко» на всей территории Республики Беларусь:

№ п/п	Магазин	№ п/п	Магазин
1.	г. Барановичи, ул. Советская, 105А	17.	г. Жлобин, ул. Микрорайон-1, 1
2.	г. Бобруйск, ул. Минская, 15	18.	г. Лида, ул. Кирова, 8
3.	г. Бобруйск, ул. Советская, 82	19.	г. Минск, ул. Козлова, 2
4.	г. Брест, ул. Машерова, 39	20.	г. Минск, ул. Кошевого, 35
5.	г. Брест, ул. Московская, 332	21.	г. Минск, ул. Чкалова, 35
6.	г. Витебск, ул. 39-й Армии, 25	22.	г. Минск, проспект Независимости, 43
7.	г. Витебск, ул. Людникова, 16	23.	г. Могилев, ул. Первомайская, 40
8.	Торговый центр «Марко-Сити» г. Витебск, ул. Ленина, 26а	24.	г. Могилев, ул. Тимирязевская, 36
9.	г. Витебск, проспект Московский, 8	25.	г. Мозырь, ул. Интернациональная, 96а
10.	г. Витебск, ул. Толстого, 5	26.	г. Молодечно, ул. Б. Хмельницкого, 22а
11.	г. Витебск, проспект Черняховского, 10	27.	г. Новополоцк, ул. Молодежная, 71
12.	г. Гомель, ул. Победы, 16	28.	г. Орша, ул. Ленина, 23
13.	г. Гомель, ул. Советская, 97/2	29.	г. Пинск, ул. Первомайская, 11
14.	г. Гродно, ул. Горького, 73А	30.	г. Полоцк, ул. Коммунистическая, 28
15.	г. Гродно, ул. Ожешко, 36	31.	г. Светлогорск, м-н Первомайский, 3а
16.	г. Гродно, ул. Космонавтов, 4	32.	г. Солигорск, ул.Козлова, 46а

за исключением магазинов:
г. Гродно, ул. К. Маркса, 21
г. Витебск, Смоленский рынок

4. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

Детская обувь (любого сезона) с 27 размера, за исключением домашней обуви, с товарным знаком «Марко», «Сан Марко».

5. Призовой фонд Игры.

Призовой фонд Игры формируется за счет имущества Организатора (Частного предприятия «Сан Марко»), который составляет 19 694 125 (девятнадцать миллионов шестьсот девяносто четыре тысячи сто двадцать пять) белорусских рублей и включает следующие призы:

№ п/п	Наименование	Количество, шт.	Стоимость за единицу, в руб. РБ	Общая сумма, руб. РБ
1.	**Рюкзак красный с нанесением логотипа**	166	23 000,00	3 818 000
2.	**Рюкзак Urban, art. 70600145 с логотипом**	125	22 950,00	2 868 750
3.	**Кружка керамическая арт. 8788806 с логотипом**	330	30 243,60	9 980 388
4.	**Кепка с козырьком с логотипом «Марко»**	235	3 300,00	775 500
6.	**Блокнот А6 на пружине**	150	8 929,08	1 339 362
7.	**Ручка шариковая с логотипом 12427-30**	150	6 080,83	912 125
	ИТОГО:	**1 156**		**19 694 125**

6. Участники Рекламной Игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, выполнившие условия участия в Рекламной Игре. В случае, если в Рекламной игре принимают участие несовершеннолетние (недееспособные или ограниченно дееспособные), то участие таких лиц осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и настоящими правилами Рекламной игры (далее – «Участники»).

К участию в Рекламной Игре не допускаются члены комиссии Рекламной Игры.

7. Порядок участия в Рекламной Игре и получения призов:

7.1. Условия участия в Рекламной Игре:

Для участия в Рекламной Игре необходимо в период с 19 августа 2013 года по 31 августа 2013 года:

• приобрести детскую обувь (любого сезона) с 27 размера, за исключением домашней обуви, с товарным знаком «Марко», «Сан Марко»;

• при условии окончания номера кассового чека на цифру «10» первым обратиться к продавцу-кассиру магазина за призом.

7.2. Порядок получения приза:

• Участник может получить на выбор один из четырех видов приза в день обращения в магазине, в зависимости от наличия призов. В случае отсутствия какого-либо вида призов на момент обращения участника, участник вправе выбрать приз из оставшихся в наличии.

• Призы получают участники, первыми обратившиеся за получением приза.

• Для получения приза Победитель должен предъявить паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь либо удостоверение беженца, подтверждающее статус беженца в Республике Беларусь.

• В случае если победителем является несовершеннолетний, то при получении приза вместе с Победителем должны присутствовать его законные представители (родители, усыновители, опекуны, попечители) со своим паспортом (видом на жительство, удостоверением беженца) и свидетельством о рождении либо паспортом несовершеннолетнего.

• В случае если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям, при предъявлении подтверждающих полномочия последних документов.

• В случае если Победитель не может получить приз лично, Приз может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство, удостоверения беженца) и доверенности от Победителя, заверенной нотариально.

• Целостность и функциональная пригодность приза должна проверяться участниками непосредственно при его получении. Организаторы не несут ответственности за любые повреждения приза, возникшие после передачи последнего участнику.

• Выдача призов осуществляется в следующих фирменных магазинах «Марко» на территории Республики Беларусь в срок до 31 августа 2013 года либо пока призы будут в наличии:

№ п/п	Магазин	Рюкзак Urban, art.70600145 с логотипом	Рюкзак красный с нанесением логотипа	Кружка керамическая арт. 8788806 с логотипом	Кепка с козырьком с логотипом «Марко»	Комплект ручка шариковая с логотипом 12427-30 и блокнот А6 на пружине: Ручка шариковая с логотипом 12427-30	Комплект ручка шариковая с логотипом 12427-30 и блокнот А6 на пружине: Блокнот А6 на пружине
1.	г. Барановичи, ул. Советская, 105А	-	16	17	9	5	5
2.	г. Бобруйск, ул. Минская, 15	-	8	10	7	4	4
3.	г. Бобруйск, ул. Советская, 82	-	8	10	7	5	5
4.	г. Брест, ул. Машерова, 39	-	9	11	8	5	5
5.	г. Брест, ул. Московская, 332	-	10	12	6	5	5
6.	г. Витебск, ул. 39-й Армии, 25	1	-	1	6	4	4
7.	г. Витебск, ул. Людникова, 16	8	-	10	7	5	5
8.	Торговый центр «Марко-Сити» г. Витебск, ул. Ленина, 26а	14	-	14	8	5	5
9.	г. Витебск, проспект Московский, 8	2	-	2	6	4	4
10.	г. Витебск, ул. Толстого, 5	8	-	10	7	5	5
11.	г. Витебск, проспект Черняховского, 10	13	-	14	8	5	5
12.	г. Гомель, ул. Победы, 16	13	-	14	8	5	5
13.	г. Гомель, ул. Советская, 97/2	10	-	12	8	5	5
14.	г. Гродно, ул. Горького, 73А	8	-	8	7	4	4
15.	г. Гродно, ул. Космонавтов, 4	8	-	8	7	4	4
16.	г. Гродно, ул. Ожешко, 36	6		7	7	4	4
17.	г. Жлобин, ул. Микрорайон-1, 1	2	4	7	6	4	4
18.	г. Лида, ул. Кирова, 8	-	6	7	7	4	4
19.	г. Минск, ул. Козлова, 2	-	14	15	8	5	5
20.	г. Минск, ул. Кошевого, 35	-	14	14	8	5	5
21.	г. Минск, ул. Чкалова, 35	-	8	10	7	5	5
22.	г. Минск, пр-т Независимости, 43	-	8	10	7	5	5
23.	г. Могилев, ул. Первомайская, 40	13	-	14	8	5	5
24.	г. Могилев, ул. Тимирязевская, 36	13	-	14	6	5	5
25.	г. Мозырь, ул. Интернациональная, 96а	6	-	7	7	4	4
26.	г. Молодечно, ул. Б. Хмельницкого, 22а	-	8	10	8	5	5
27.	г. Новополоцк, ул. Молодежная, 71	-	8	10	8	5	5
28.	г. Орша, ул. Ленина, 23	-	9	11	8	5	5
29.	г. Пинск, ул. Первомайская, 11	-	14	14	8	5	5
30.	г. Полоцк, ул. Коммунистическая, 28	-	8	10	8	5	5
31.	г. Светлогорск, м-н Первомайский, 3а	-	8	10	8	5	5
32.	г. Солигорск, ул. Козлова, 46а	-	6	7	7	4	4
	ВСЕГО:	**125**	**166**	**330**	**235**	**150**	**150**

7.3. Иное:

Участники Рекламной Игры, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Рекламной Игры для получения призов, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

8. Регламент деятельности комиссии по проведению Рекламной Игры.

Для контроля над проведением Рекламной Игры Организатор создает комиссию в составе пяти человек.

Комиссия следит за ходом Рекламной Игры и утверждает ее результаты.

Созыв заседаний комиссии осуществляется ее Председателем по своей инициативе или по инициативе любого из ее членов, а также по просьбе участников Рекламной Игры. Решения комиссии принимаются большинством голосов от общего количества голосов членов комиссии. Каждый член комиссии обладает одним голосом.

При равенстве количества голосов, поданных «за» и «против» предлагаемых решений, право решающего голоса имеет Председатель комиссии. Решения комиссии оформляются протоколом, который должен быть подписан всеми присутствующими на заседании членами комиссии.

Персональный состав комиссии утверждается приказом директора Частного предприятия «Сан Марко».

В состав комиссии входят пять человек — председатель и четыре члена комиссии.

9. Состав комиссии по проведению Рекламной Игры.

Председатель комиссии – Кочмар Владимир Брониславович – главный инженер Частного предприятия «Сан Марко».

Члены комиссии: Капитонова Ирина Александровна – заместитель директора по коммерческим вопросам Частного предприятия «Сан Марко»;

Гаврилова Елена Вячеславовна – главный бухгалтер Частного предприятия «Сан Марко»;

Демидова Елена Леонидовна – начальник отдела маркетинга и рекламы СООО «Марко»;

Князева Оксана Владимировна – специалист по маркетингу и рекламе Частного предприятия «Сан Марко».

10. Особые условия Рекламной игры:

• Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

• Участникам Рекламной Игры не может быть выплачен денежный эквивалент стоимости призов.

• Сотрудники Организатора не вступают в споры с участниками Рекламной Игры относительно организации и условий передачи призов.

• Все возможные претензии участников Рекламной Игры в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору.

• Факт участия в Рекламной Игре означает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами Рекламной Игры.

• Обязательства по уплате подоходного налога в соответствии с законодательством Республики Беларусь в связи с получением призов полностью возлагаются на Победителей

• Правила Рекламной Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной Игры. Сведения о результатах проведения Рекламной Игры будут опубликованы также в газете «Звязда» не позднее 30 сентября 2013 года.

• Участвуя в Рекламной Игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной Игре.

• Возможные претензии Участников в отношении организации Игры должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 210026, г. Витебск, проспект Людникова, д. 10, тел. (0212) 54-90-31.

Свидетельство № 2219 от 16.08.2013 г. о государственной регистрации Рекламной игры, выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

Общество с ограниченной ответственностью «РЛК ИНВЕСТ»

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Будь вместе с нами и выигрывай море призов и поездку в Египет»

1. Организатор:

Общество с ограниченной ответственностью «РЛК Инвест», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191444326, свидетельство о регистрации юридических лиц выдано Минским горисполкомом 10 марта 2011 г.; юридический адрес: Республика Беларусь, 220092, г. Минск, ул. Дунина-Марцинкевича, 2, корпус 1, помещение 7. УНП 191444326.

2. Наименование Рекламной игры:

«Будь вместе с нами и выигрывай море призов и поездку в Египет».

3. Территория проведения Рекламной игры:

Город Минск.

4. Срок проведения Рекламной игры:

С 17 апреля 2013 г. по 31 августа 2013 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

5. Свидетельство № 2155 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 15 апреля 2013 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

6. В Рекламной игре приняло 805 участников.

7. Призовой фонд Рекламной игры по всем призам разыгран в полном объеме.

8. Фамилии, инициалы победителей призов:

Главный приз: Путевка на 2-х в Египет: Шифрина О.М.

Фильтр для воды обратного осмоса RO-7-NL: Ковалевич В.И.; Вербицкая И.П.; Розум С.В.; Латышева М.В.; Мамедова Т.Ш.; Денисова Л.П.; Андрухович Е.В.; Кушель А.В.; Силутин А.А.; Валюженец А.Г.

Фильтр д/душа AWF с засыпкой нанокластеры: Баранович Т.С.; Шаповалова Н.А.; Гайдук О.С.; Хамазюк А.Я.; Суша Ю.В.; Коленик Н.И.; Слыш Е.С.; Кирпиченок М.Ю.; Савчук Д.В., Кезик М.Р.

Фильтр для стиральной машины: Яхимович В.Н.; Щурко Ж.Н.; Латышева В.К.; Прихотько А.Ф.; Бузун В.Ю.; Перов К.А.; Алехно Ю.С.; Лобас Т.В., Ходаненок В.Г.; Знак Е.В

9. Телефон для справок: 8 (017) 390 06 16.

Полные правила игры были опубликованы в газете «ЗВЯЗДА» № 71 от 17 апреля 2013 г. и на официальном сайте компании: **www.bluefilters.net.**

Свидетельство № 2155 от 15.04.2013 г. о государственной регистрации Рекламной игры, выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) 3 сентября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (017) 200 20 89.

НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ:

Сведения о предмете аукциона	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (учебный корпус) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Павловского, д. 58
Начальная цена предмета аукциона	9 414 633 151 белорусский рубль (в том числе: начальная цена недвижимого имущества – 9 186 177 871 белорусский рубль, начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 228 455 280 белорусских рублей)
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	1 800 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе**
Продавец недвижимого имущества	Государственное учреждение «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24, конт. тел.: 8 (017) 266 52 33; 266 84 55
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Общая площадь – 0,1478 га; вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году и не осуществляется с 1993 года; стены – железобетонные панели, кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; степень готовности объекта – 44%
Условия использования земельного участка	В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для дальнейшего использования объекта под научно-образовательное учреждение. Государственному учреждению «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» обеспечить проезд транспортных средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона к незавершенному незаконсервированному капитальному строению (учебный корпус)
Условия по продаже недвижимого имущества	Сохранение функционального назначения объекта – научно-образовательное учреждение*

* Принять к сведению, что в соответствии с генеральным планом г. Минска объект расположен в зоне специального назначения, где не допускается изменение вида использования территории такого типа без соответствующих градостроительных обоснований и регламентов, разрабатываемых и утверждаемых в установленном порядке в градостроительных проектах детального планирования.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Извещение о проведении аукциона ранее опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2013 № 128 (27493).

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 28 августа 2013 г. включительно.

К участию в аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

